Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 248 (508)
ЛІСТАПАДА
4
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVI

Москва
Старая Площадь 4 ЦК ВКП(б) Информационный Отдел
на 1934 г. Звезда—1

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ВЫТВОРЧЫЯ ПЕРАМОГІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, СНК БССР—тав. СААК'ЯНУ, РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ „ЗВЯЗДА.

Віцебская партарганізацыя пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і пры яго непасрэдным штодзённым дапамозе ўступіла ў перыяд перавыбараў советаў і падыходзіць да XVII гадавіны Кастрычніка з наступнымі паказальнікамі выканання промфінплана. За настрычнік па рэспубліканскай і саюзнай прамысловасці план выкананы на 102,8 проц., за 10 месяцаў 1934 года — на 102,7 проц. (план 129,014 руб. — выканана 132.467 руб.). За тры кварталы сабекошт па 21 прадпрыемству саюзнай і рэспубліканскай прамысловасці ў сярэднім знижан на 2,6 проц. супроць плана 1,5 проц. Сярэдняя колькасць рабочых складае 97,9 проц. пры расходаванні фонда заработнай платы на 100 проц. Перавыкананы план прадукцыйнасці працы на 4,4 проц. пры агульным палепшэнні якасці прадукцыі і зніжэнні браку.

Пераключаем сілы на тэрміновае і якаснае выкананне плана апошняга квартала, на барацьбу за правы заняцця прамысловасці горада Віцебска ў чырвоную кнігу імя XI з'езда советаў БССР.

САКРАТАР ГАРКОМА КП(б)Б ЖУРАЎЛЕЎ.
СТАРШЫНЯ ГОРСАВЕТА АБЕРЫН.
СТАРШЫНЯ ГОРПРОФСОВЕТА ЕСЬКО.

СЦЯГ ПЕРАДАН МЕНСКАМУ РАЕНУ

Магілеўскі раён занесен на чорную дошку

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

СЦЯГ ЦК КП(б)Б І СНК БССР ПА ЗЕРНАВОЙ ЗОНЕ ПЕРАДАЕЦЬ МЕНСКАМУ РАЕНУ, які першым у БССР выканаў план ільнозагатовак, бульбазагатовак і заданне па хлебазакупках. Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць АРШАНСКІ і ПРАПОЙСКІ раёны, папярэдзіўшы іх аб неабходнасці ліквідаваць сваё адставанне ў мясапастаўках. Дадаткова занесці на чырвоную дошку і запісаць кандыдатам на атрыманне сцяга ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКІ раён, папярэдзіўшы аб адставанні па бульбазагатоўках.

Камісія лічыць, што Віцебск — пры ўзмацненні тэмпаў ільнозагатовак, Касцюковічы — пры ўзмацненні тэмпаў мясапаставак, Асіповічы і Любань — пры ўзмацненні тэмпаў хлебазакупак могуць дабіцца права быць занесенымі ў лік кандыдатаў на атрыманне пераходнага чырвонага сцяга.

Сцяг ЦК і СНК па ільнаводчай зоне пакінуць за Сенненскім раёнам, адзначыўшы, што за апошні час раён крыху здаў тэмпы ільнозагатовак і закупак хлеба.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць Бешанковіцкі і Лёзненскі раёны, папярэдзіўшы першы аб неабходнасці ліквідаваць адставанне ў мясапастаўках, другі у хлебазакупках.

Камісія адзначае, што амаль усе раёны БССР ганебна адстаюць у засыпцы насенных фондаў. Пры абмеркаванні ў наступную пяцідзёнку пытанняў занясення таго ці іншага раёна на чырвоную і чорную дошку камісія будзе прымаць пад увагу і засыпку насенных фондаў.

За недапушчальнае адставанне ў выкананні планаў ільнозагатовак, мясапаставак і заданняў па хлеба закупках, пакінуць на чорнай дошцы ДУБРОВЕНСКІ, НАРАЎЛЯНСКІ, ПЕТРЫКОЎСКІ і ЛЕЛЬЧЫЦКІ раёны. Дадаткова занесці на чорную дошку МАГІЛЕЎСКІ і ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ раёны.

Старадарожскі, Ельскі, Чэрвеньскі, Рэчыцкі і Гомельскі раёны, якія падцягнуліся ў ільнозагатоўках, зняць з чорнай дошкі, але папярэдзіць іх, што далейшае адставанне ў хлебазакупках, а Гомеля і ў мясапастаўках, зноў можа паставіць перад камісіяй пытанне аб заняцці іх кандыдатамі на чорную дошку.

Кандыдамі на чорную дошку запісаць РАГАЧОЎСКІ і КАГМЕНСКІ раёны. Зняць з кандыдатэў на чорную дошку Чачэрскі раён, папярэдзіўшы аб тым, што ён адстае ў хлебазакупках.

Камісія папярэджвае кіраўніцтва ХОЙНІЦКАГА, ПАРЫЦКАГА і БРАГІНСКАГА раёнаў аб тым, што калі гэтыя раёны ў наступную пяцідзёнку не ліквідуюць адставання па ільнозагатоўках, яны будуць запісаны кандыдатамі на чорную дошку.

Закончыць ільнозагатоўкі першымі ў СССР!

Апошняя пяцідзёнка ільнозагатовак дала поўны эрух. Калі прырост за чацвертую пяцідзёнку складаў 7 проц., а за пятую — 6, то за шостую (улічваючы, што ў іншай пяцідзёнцы 6 дзён) мы ўзялі 14,1 проц. Гэты эрух з'яўляецца прамым рэзультатам тых арганізацыйных мер, якія былі прыняты ЦК КП(б)Б у канцы кастрычніка. Тут перш за ўсё адыграла ролю пасылка ў дапамогу раёнам значнай колькасці цэнтральнага актыва. 6-я пяцідзёнка кастрычніка наглядна паказала, **што тэмпы ільнозагатовак запежаць выключна ад нас самых.** Варта было толькі партыйным, совецкім і іншым арганізацыям **аператыўна** узяцца за ільнозагатоўкі, як крыва ільнозагатовак хутка пайшла ўгэрх. Два раёны (Менск і Орша) ужо скончылі план ільнозагатовак. Прычым, калі прыклад Оршы маючай паравнаўча вялікі план наглядна абвяргае спасылкі на аб'ектыўныя труднасці ў раёнах з большым планам, то Менск дае бліскучы прыклад спалучэння тэмпаў апрацоўкі ільну з іх высокай якасцю. **Менск здаў валакно нумарам вышэй дакага яму задання.**

І Менск і Орша, скончыўшы план, не павінны ні ў якім выпадку спыняць ільнозагатовак. Не цяжка дабіцца перавыканання планаў, калі растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам, што на кожнае кіло ільну, **здаванае звыш** плана, ільнездатчык атрымлівае хлеба на 50 проц. больш, чым атрымліваў ён на лён, **заданы ў лік плана.**

Гаворачы аб прыросце здачы ільну за пяцідзёнку мы не можам абмежавацца агульнай канстатацыяй факту. Сярэднія лічбы могуць толькі змазаць той факт, што, побач з раёнамі, якія па-большэвіцку змагаюцца за лён, мы маем раёны, якія ганебна топчуцца на месцы, кіраўніцтва якіх па-ранейшаму займаецца заклінаннямі і балбатнёй. Калі да перыяду можна адносіць такія раёны, як Чашнікі, якія далі прырост 32,5 проц., Бягомль — 29 проц., калі рад раней адставаўшых раёнаў (Камарын, Старыя Дарогі, Бялынічы) здолелі дасягнуць па 20-30 проц. за пяцідзёнку, то ў такіх раёнах, як **Магілеў, Дуброўна, Чырвонаполле** па-ранейшаму толькі балбочуць аб ільнозагатоўках. Возьмем Магілеў (сакратар РК Равіцкі, старшыня РВК Пушчын). Гэты раён з буйнейшай патэнцыяльнасцю, мае ненізкі план ільнозадачы, прычым каля паловы плана здае трастой. І што-ж мы бачым? **На 1 лістапада Магілеў выканаў толькі 29 проц.; за апошнюю пяцідзёнку даў усяго 43 проц.** Хіба такія вынікі не з'яўляюцца ганебнымі для Магілева? Хіба не гаворыць яны аб тым, што партыйна-совецкае кіраўніцтва Магілева займаецца заклінаннямі і балбатнёй, а не канкрэтным аператыўным кіраўніцтвам?

Тэмпы апошняй пяцідзёнкі не з'яўляюцца такімі вялікімі, што іх нельга перавысіць. Мы маем усе магчымасці яшчэ больш узмацніць гэтыя тэмпы. Для гэтага неабходна перш за ўсё пераключыць на апрацоўку ільну 75-80 проц. усіх калгаснікаў. Для гэтага неабходна рашуча правесці ў жыццё закон урада аб выдачы хлеба ільнездатчыкам і яго размеркаванні выключна па ільняных працаднях. Для гэтага неабходна не менш рашучае правядзенне закона ўрада аб наличэнні двух працадзён за выкананне дзённай нормы па ільну.

Але ні ў якай меры мы не павінны ператвараць барацьбу за большэвіцкія тэмпы ільнозагатовак у рэкардменства. Усякае рэкардменства было-б злачынствам і шкодна адбілася-б на якасці валакна.

Мы павінны а усёй сілай падкрэсліць, што **якасць загатаўляемага валакна да гэтага часу ў нас знізалася з пяцідзёнкі ў пяцідзёнку.** Асабліва ганебныя якасныя паказальнікі даюць раёны Рагачоўскі (сакратар РК **Гаўрасёў**, старшыня РВК **Зялёнка**), Чавускі (сакратар РК **Кулікаў**, старшыня РВК **Буры**), Сіроцінскі (сакратар РК **Ляхаў**, старшыня РВК **Берсуковіч**), Расонскі (сакратар РК **Чуманоў**, старшыня РВК, **Партнеў**), Асвейскі (сакратар РК **Сердзюкоў**, старшыня РВК **Мартынаў**). Тут валакно ніжэйшае па 1½ проц. ніжэй задання.

Устае пытанне, аб чым думаюць кіраўнікі гэтых раёнаў. Хіба ў Асіповічах і Чырвонай Слабадзе, якія канчаюць ільнозагатоўкі і здаюць валакно на 1½ нумара вышэй задання, іншыя ўмовы, чым у вышэйуказаных раёнах? Усё залежыць ад кіраўніцтва. **Агратэхнічныя і арганізацыйныя** меры барацьбы за высокую якасць даны ў рашэнні ЦК і СНК і не раз папулярызаваны «Звяздой». Да ліку агратэхнічных мерапрыемстваў адносіцца перш за ўсё сартаванне трасты перад пасадкай у ёмкі, здлежка пасля ёмкі і мяцця, трапанне спачатку начорна, потым набела, сартаванне і падвязка ўжо атрапанага валакна і т. д.

Трэба зацікавіць калгаснік і калгаснікаў у **якасці** валакна, пастаянны аплату па апрацоўцы ў залежнасць ад якасці здаваемага валакна (пацрабязныя ўказаньні па гэтаму пытанню «Звязда» дала ў перадавым ад 27 кастрычніка).

Вопыт барацьбы за лён калгаса «Перамога», здаўшага звыш 100 цэнтнераў валакна сярэднім нумарам 12½, вопыт, які мы асвятлялі сёння на старонках «Звязды», наглядна паказвае, што якасць валакна ў нашых руках.

Большэвікі БССР здолелі дабіцца перамены ў тэмпах ільнозагатовак. Яны павінны неадкладна забяспечыць пералом і ў якасці здаваемага валакна.

На ходу ільнозагатовак БССР высунулася ў лік перадавых раёнаў Саюза. **Мы маем усе магчымасці закончыць ільнозагатоўкі першымі па СССР і мы павінны ператварыць у сапраўднасць гэту магчымасць.**

ЧЛЕН СЕЛЬСОВЕТА ПАЛЯКОВА АДНОЎЛЕНА Ў КАЛГАСЕ

ЧАРЫКАЎ (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

Па матэрыялах «Звязды» аб няправільным выключэнні з калгаса актывісткі члена сельсовета **Палякова** (гл. «Звязду» ад 28 кастрычніка, **Рэд**), РК КП(б)Б выдзеліў камісію. Камісія ўстанавіла няправільнасць яе выключэння, якое зроблена з мэтай скампраметаваць Палякову.

На агульным сходзе калгаснікаў Палякова адноўлена ў калгасе. Старшыня калгаса **Каверын** прыцягваецца да судовай адказнасці.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня РВК Турэцкі);

АРШАНСКІ раён (сакратар РК Сескін, старшыня РВК Міцькоў);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

БЕШАНКОВІЦКІ раён (сакратар РК Каждан, старшыня РВК Грышчанка);

ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ раён (сакратар РК Бурдзілаў, старшыня РВК Уткін);

ЛЁЗНЕНСКІ раён (сакратар РК Дзеніскевіч, старшыня РВК Шульга);

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК Кавалёў, старшыня РВК Чорнабродаў).

СЕННЕНШЧЫНА ВЫКАНАЛА ПЛАН ІЛЬНОЗАГАТОВАК

ЦК КП(б)Б—тав. Гікало, СНК БССР—тав. Галадзеду, ЦВК БССР—тав. Чарвякову, рэдакцыі газеты „ЗВЯЗДА"

Паведамляем, што на 3 лістапада Сенненскі раён на 2 месяцы раней мінулага года выканаў план ільнозагатовак. Вядзем работу па перавыкананню плана. На склады здана прадукцыі па якасці вышэй устаноўленай урадам.

Рашаючае значэнне ў барацьбе за высокаякасную ільнопрадукцыю мела праведзеная раней сяўба, трайное цераблення, ужыванне агрэгатаў пры пярэчнай апрацоўцы, шырока разгорнутае соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, высунуўшыя ізотаўцаў ільну, даўшых па 30-35 фунтаў валакна ў дзень. Такіх у раёне нямала.

У барацьбе за перадавое месца ў рэспубліцы раён перавыканаў план заблізага ворыва, сілосавання. Поўнасцю ўбрана бульба, засыпаны насенныя і страхавыя фонды бульбы, канчаем падрыхтоўку жывёлы да зімы, канчаем закупкі хлеба і інш.

У выніку гэтых поспехаў сельскагаспадарчага года пачаўся масавы прыліў у калгасы. За апошнія дні арганізаваны два калгасы.

Перавыбарчую кампанію советаў скарыстаем для мабілізацыі калгаснікаў і аднаасобнікаў раёна на далейшае ўмацаванне калгасаў, на большэвіцкае завяршэнне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній гэтага года, на падрыхтоўку да наступнага гаспадарчага года, каб у 1935 г. пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і тав. Гікало Сенненшчына дабілася яшчэ большых перамог, замацавала за сабой перадавое месца ў рэспубліцы.

Сакратар РК КП(б)Б КАЦ.
Старшыня РВК КАЧУК.
Нач. палітаддзела СЫТОЎ.

Чорная дошка

Па эрыху выканання планаў перапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі і іншых паставак дзяржаве камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносіць на чорную дошку:

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК **Арашчук**, старшыня РВК **Град**);

НАРАЎЛЯНСКІ раён (сакратар РК **Кагачонак**, старшыня РВК **Зількія**);

ДУБРОВЕНСКІ раён (сакратар РК **Мышалаў**, старшыня РВК **Мацько**);

ЛЕЛЬЧЫЦКІ раён (сакратар РК **Азінскі**, старшыня РВК **Гаўрусёў**);

МАГІЛЕЎСКІ раён (сакратар РК **Равінскі**, старшыня РВК **Пушчын**);

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ раён (сакратар РК **Лапацёў**, старшыня РВК **Дупан**).

Якасць валакна—асноўнае звяно ільнозагатовак

ХОД ЗАГАТОВАК ІЛЬНУ, ПЯНЬКІ, БУЛЬБЫ, МЯСАПАСТАВАК І ССЫПКІ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА БССР

на 1 лістапада 1934 года

РАЁНЫ	ЗДАНА: Ільнопрадукцыі	ЗДАНА: валакна	ЗДАНА: трасты	ЗАГАТОЎЛЕНА: ільну	ЗАГАТОЎЛЕНА: бульбы	ЗАГАТОЎЛЕНА: мясапастаўкі	Ссыпка насення зерневых
Менскі	101,4	101,4	—	33,7	101,2	79,3	23,3
Аршанскі	100,0	100,9	96,8	27,2	96,7	76,3	79,5
Сенненскі	92,9	84,9	100,3	6,5	92,3	81,1	23,9
Дрысенскі*)	88,7	57,7	77,6	—	92,9	90,1	27,8
Асвейскі	87,4	69,5	94,0	—	92,3	84,1	—
Ч.-Слабодскі	86,2	86,2	—	74,4	79,6	77,0	—
Касцюковіцкі	83,1	75,2	101,6	0,9	94,3	67,2	38,3
Бешанковіцкі	82,7	76,9	86,6	1,4	97,2	75,8	60,7
Лёзненскі	82,6	66,1	92,2	—	87,2	78,2	31,3
Прапойскі	82,5	82,5	—	3,4	86,1	76,9	57,6
Сіроцінскі	82,2	132,8	72,4	—	85,6	79,4	43,0
Асіпавіцкі	81,3	81,3	—	35,6	93,3	80,3	25,8
Полацкі	80,8	65,5	93,2	6,7	88,8	77,9	47,9
Любанскі	74,5	74,5	—	26,8	99,9	92,1	71,1
Віцебскі	72,6	72,6	—	—	90,9	78,9	49,5
Старобінскі	71,0	71,0	—	3,6	91,1	88,5	51,2
Бягомльскі	68,5	68,5	—	39,0	90,5	82,5	84,6
Смаляўіцкі	68,2	68,2	—	57,0	95,5	78,8	27,2
Чашніцкі	68,0	49,2	89,0	1,7	93,4	78,5	41,0
Расонскі	64,9	69,9	29,6	12,5	90,8	81,1	—
Суражскі	64,8	73,4	61,4	3,3	89,9	86,4	69,5
Талачынскі	64,4	58,0	72,0	—	86,3	71,2	39,6
Лепельскі	64,3	45,0	74,6	—	82,7	74,1	33,6
Шклоўскі	64,0	47,7	82,1	5,8	92,2	77,6	17,6
Бялыніцкі	63,3	63,3	—	16,0	87,7	76,9	104,6
Крычаўскі	62,9	48,2	73,2	0,5	88,6	75,5	—
Ушацкі	61,9	28,8	99,8	5,0	88,5	78,9	35,5
Круглянскі	61,8	41,8	77,3	26,0	89,7	63,9	70,0
Камарынскі	61,7	61,7	—	40,8	95,9	89,9	12,6
Чэрыкаўскі	57,0	57,0	—	9,0	96,7	77,4	43,0
Слуцкі	56,8	56,8	—	8,3	94,3	84,8	60,0
Уздзенскі	55,1	55,1	—	35,0	92,8	85,4	26,0
Горацкі	54,9	55,4	54,0	1,5	93,2	82,0	43,6
Бабруйскі	54,7	10,4	113,6	11,4	87,9	77,1	26,0
Б.-Кашалёўскі	53,7	53,7	—	13,8	85,5	85,8	126,4
Пухавіцкі	53,7	53,7	—	6,1	85,4	75,2	32,3
Барысаўскі	53,7	53,7	—	75,9	88,8	68,9	82,7
Церахаўскі	52,6	44,1	64,6	22,0	89,2	73,8	82,5
Бярэзінскі	51,8	51,8	—	10,2	87,4	77,1	7,8
Капыльскі	50,5	50,5	—	9,0	93,9	79,6	20,3
Тураўскі	50,2	50,2	—	62,7	85,5	84,0	80,9
Жыткавіцкі	50,0	50,0	—	31,5	95,6	84,0	4,9
Гарадоцкі	49,6	37,1	63,8	—	89,1	77,9	77,5
Жлобінскі	48,7	48,7	—	15,3	92,2	75,4	61,8
Плошчанскі	47,5	47,5	—	33,1	91,2	66,8	30,2
Мазырскі	47,3	47,3	—	30,8	91,5	80,1	60,6
Лоеўскі	46,6	46,6	—	58,3	85,7	82,5	73,3
Заслаўскі	46,5	46,5	—	9,0	91,1	74,5	13,7
Дзяржынскі	45,8	45,8	—	10,7	93,8	76,2	17,8
Глускі	45,5	45,5	—	36,2	91,2	75,6	56,9
Ст.-Дарожскі	45,5	45,5	—	13,3	89,8	84,4	0,9
Уваравіцкі	44,9	21,8	61,9	5,0	93,1	77,5	18,2
Клічаўскі	44,1	44,1	—	35,7	89,6	68,2	—
Веткаўскі	43,3	43,3	—	2,7	84,8	65,5	57,0
Чачэрскі	43,2	43,2	—	75,0	87,8	81,6	52,1
Клімавіцкі	43,0	43,0	—	3,5	89,3	74,8	52,1
Мсціслаўскі	42,9	18,8	66,1	—	89,9	71,8	26,5
Гомельскі	42,0	42,0	—	14,0	89,6	71,6	72,3
Чавускі	41,9	40,0	43,9	5,5	90,1	75,8	59,2
Чэрвеньскі	40,1	40,1	—	37,0	88,4	68,8	6,1
Рэчыцкі	39,6	39,6	—	27,5	89,4	75,9	—
Быхаўскі	39,6	39,6	—	16,7	83,0	78,0	—
Лагойскі	37,8	37,8	—	26,5	87,5	73,1	23,4
Ельскі	36,6	36,6	—	30,8	84,3	82,1	—
Брагінскі	36,5	36,5	—	41,2	102,9	84,5	—
Хойніцкі	36,3	36,3	—	15,4	97,1	78,9	—
Парыцкі	34,9	34,9	—	12,9	87,8	81,5	52,0
Кармянскі	34,9	15,3	60,5	3,0	85,6	78,7	11,2
Рагачоўскі	34,8	19,0	58,4	7,5	90,8	77,4	15,1
Ч.-Польскі	30,9	7,6	54,4	0,8	79,6	64,4	41,2
Лельчыцкі	29,1	29,1	—	36,6	80,3	73,9	52,7
Маглеўскі	29,0	14,4	51,6	3,3	81,0	65,7	47,9
Петрыкоўскі	26,3	26,3	—	36,0	84,6	50,8	55,3
Нараўлянскі	25,4	25,4	—	38,1	82,3	80,7	—
Дубровенскі	21,4	21,4	—	—	87,8	73,0	57,9
Разам па БССР	60,6	49,5	76,6	17,4	90,0	76,8	40,2

*) Процант выканання плана ільнозагатовак па Дрысенскаму раёну выведзен, выходячы з удакладненага плана.

ЛЁЗНЕНСКІ РАЁН КАЛЕКТЫВІЗАВАН НА 90 ПРОЦ.

ЛЁЗНА, 3 лістапада. **(Па тэлефону).**

У калгасы Лёзненскага раёна за апошні час уступіла звыш 900 аднаасобнікаў. Арганізавана 11 новых калгасаў. Раён калектывізаван больш чым на 90 проц. Пяць сельсоветаў — Добрамыслянскі, Асіпаўскі, Лёзненскі, Гарбаўскі і Чарніцкі завяршылі суцельную калектывізацыю.

ГАРБАРОЎ.

ВЫПУСКНІКІ ПОЛІТЭХНІЧНАГА ІНСТЫТУТА У т. ГІКАЛО

3 лістапада адбылася таварыская гутарка сакратароў ЦК КП(б)Б тав. Гікало і тав. Валковіча з выпускнікамі політэхнічнага інстытута, інжынерамі-праганетыкамі.

У гутарцы з выпускнікамі тав. Гікало падкрэсліў, што натуральныя багацці Беларусі маюць вялізарныя перспектывы развіцця прамысловасці лесу і торфу. Таму асабліва важным у сэнсе развіцця гэтай прамысловасці з'яўляецца каксаванне, хімічная і газавая перапрацоўка.

Далей тав. Гікало спыніўся на праблемах скарыстання торфу, а таксама на праблеме падрыхтоўкі высокаякасных спецыялістаў.

Інжынер-выпускнік т. Крывапосаў знаёміць тт. Гікало і Валковіча са складзеным ім-жа праектам здабывання кадзянога газу і прымянення яго ў нас па тыпу Бярэзнікоўскага хімкамбіната, які абсталёван з дапамогай замежных спецыялістаў.

Інжынер-выпускнік т. **Сініцын** знаёміць з сваім праектам здабывання двайнога газу з торфу. Праблема здабывання двайнога газу з торфу мае асаблівае значэнне для БССР. Яна паложана ў аснову праекта Прапойскага камбіната.

У гутарцы інжынеры-выпускнікі спыняліся на пытаннях выкарыстоўвання смалы, якая атрымліваецца як пабочны прадукт коксавых і газавых заводаў і ўтрымлівае ў сабе каштоўныя імпартныя прадукты — фінал, воск, парафін, крызол і інш.

Пераапрацоўку гэтай смалы наша прамысловасць не асвоіла. Яшчэ зусім недастатковыя навукова-даследчыя работы ў гэтай галіне. Тав. **Гікало** звярнуў увагу інжынера **Каткоўскага**, які працаваў над праектам выкарыстоўвання смалы, на неабходнасць выкарыстаць 1935 год для больш дэтальнай навукова-даследчай работы ў гэтай галіне з тым, каб у кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1936 год уключыць праект будаўніцтва прамысловасці па выкарыстоўванню гэтага багацця Беларусі.

На развітанне тав. Гікало сказаў: «Вам, выпускнікам, прыдзецца асабліва настойліва працаваць над тым, каб прабіваць дарогу гэтай новай галіны прамысловасці ў БССР. Могуць быць і цяжкасці. Трымайце сувязь з цэнтральнымі навуковымі арганізацыямі і кожны раз звяртайцеся ў ЦК КП(б)Б. Цэнтральны камітэт з выключнай увагай адносіцца да спецыялістаў, заўсёды ім дапамагае. Смела ідзіце ўперад, змагайцеся за работу з большэвіцкай энергіяй. Выкарыстоўвайце ў сваёй рабоце па вытворчасці актыў моладзі. — гэта вялікая сіла».

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ КАНШЫРЭЙШЫ УДЗЕЛ ПРАЦОЎНЫХ АДНААСОБНІКАЎ У ПЕРАВЫБАРАХ СОВЕТАЎ

ЗЛЁТЫ-КАНФЕРЭНЦЫІ АДНААСОБНІКАЎ

СРША. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Па пастанове бюро РК КП(б)Б і прэзідыума РВК з 31 кастрычніка па 5 лістапада ў раёне праводзяцца канферэнцыі-злёты працоўных аднаасобнікаў па пытаннях перавыбараў сельсоветаў, удзелу ў перавыбарах аднаасобнікаў і завяршэння ўсіх дзяржаўных абавязацельстваў кожным аднаасобным дваром і арганізацыі новага прыліву ў калгасы.

На канферэнцыях-злётах ставіліся справаздачы перадавых калгасаў аб выніках і дасягненнях сельска-гаспадарчага года і перавагах калгаснай вытворчасці над аднаасобнай.

Галоўная мета злётаў канферэнцый—арганізацыя новага прыліву ў калгасы.

У сучасны момант [illegible] калектывізаван на [illegible] проц.

КІРУЦКІ.

У МАСАХ, АПІРАЮЧЫСЯ НА АКТЫЎ

Год таму назад пастановай Крупскага райкома партыі і РВК я быў накіраван на работу ў Хацюхоўскі сельсавет. На першым пленуме сельсавета, калі мяне праводзілі старшынёй, я сутрэўся з анекдатычным фактам. У складзе членаў сельсовета знаходзіўся поп з в. Кладкі, праўда, стрыжаны, адрокшыйся ад сана, але па гэтай змене знадворнага аблічча яго ідэалогія, вядома, не змянілася.

Прыглядаўшыся далей аказалася, што ў складзе сельсовета знаходзіўся кулак Батракоў, які карыстаўся ў мінулым 30 гектарамі зямлі. Гэтыя чужакі былі адкліканы выбаршчыкамі з сельсовета. Выключан таксама разлажыўшыйся элемент, член сельсовета з вёскі Шчаўры Пыжык, які сваімі паводзінамі толькі кампраметаваў орган пролетарскай дыктатуры.

Каб выцягнуць сельсавет з становішча адстаючага па выкананню важнейшых гаспадарча-палітычных задач, патрабавалася змена метадаў работы.

У пачатку маёй работы ў якасці старшыні ў сельсавеце знаходзілася каля 5 упаўнаважаных: адны ўязджалі, другія прыязджалі, а справа не вельмі прасоўвалася наперад. Яно і зразумела: прыязджалі людзі на кароткі час і не маглі ведаць актыва. Працавалі, часамі не лічачыся з сельсветам, трымалі на сходах гарачыя і доўгія прамовы. Іх выслухоўвалі, але справе гэта дапамагала мала. Патрабаваліся арганізацыйныя мерапрыемствы на месцы. Я іх і пачаў праводзіць.

Раней секцыі пры сельсавеце не толькі не працавалі, а нават і не існавалі. Мы стварылі жывёлагадоўчую і свіназводчую, дарожную і культурна-бытавую секцыі на чале з найбольш актыўнымі членамі сельсавета т.т. Алексеенкам, Цягліцкам і інш. У буйнейшых калгасах («Чырвоны Окцябр», «Праўда», «Май» і інш.) арганізавалі дэпутацкія групы. Членаў сельсовета замацавалі за пэўнымі ўчасткамі, патрабуючы ад іх цвёрдага выканання задання.

Значных эрухаў у рабоце мы дабіліся пасля рашэнняў XVII з'езда партыі, падцягваючы арганізацыйнае кіраўніцтва да ўзроўню палітычнага, налягаючы на праверку выканання.

Пасіўных членаў совета ў нас няма. Кожны працуе ў масах, апіраючыся на калгасны актыў. Дзякуючы гэтаму работа ў нас пашла арганізавана. Веснавую сяўбу мы сёлета скончылі на 35 дзён раней, чым у мінулым годзе.

Веснавая пасеўная кампанія суправаджалася новым калгасным прыліваам. Вясной арганізавалі новыя калгасы — імя Кагановіча, імя Чарякова і імя Максіма Горкага. Вялікі прыліў у калгасы працоўных аднаасобнікаў мы маем зараз. **За год калектывізацыя павялічылася з 51 да 86 проц.**

Прыліву гэтаму спрыялі поспехі існуючых калгасаў, рост іх гаспадарчай магутнасці, значнае павелічэнне вагі працадня калгасніка. У мінулым годзе на працадзень па калгасах Хацюхоўскага сельсавета прыпадала 1-1,2 кілограма збожжа і 3-4 кілограма бульбы; у гэтым годзе 2-3 кгр. збожжавых і 7-8 кгр. бульбы. Асобныя калгаснікі, як, напрыклад, К. Рогаў і Макоўскі (калгас «Чырвоны Окцябр»), **атрымліваюць па 250 пуд. збожжавых і 1200 пудоў бульбы.**

Окцябрскія святы мы сустракаем выкананнем усіх асноўных сельска-гаспадарчых работ, у тым ліку і сканчэннем апрацоўкі ільну і здачы дзяржаве ільнопрадукцыі.

Гэтых поспехаў сельсавет дабіўся дзякуючы дзелавой, канкрэтнай дапамозе палітаддзела МТС у рабоце калгаснікаў і совета.

Пачатая перавыбарчая кампанія советаў спрыяе яшчэ большаму ўмацаванню органаў пролетарскай дыктатуры і палепшэнню работы па ажыццяўленню гістарычных задач, пастаўленых нашай партыяй, набудовы ў другой пяцігодцы бясклассавага сацыялістычнага грамадства.

ЖГУН,
старшыня Хацюхоўскага сельсовета.

АДНААСОБНІКІ СССР КАЖУЦЬ ПЕРАВЫБАРЫ СОВЕТАЎ УСТУПЛЕННЕМ У КАЛГАСЫ

Глыбачанскі сельсавет, Ушацкага раёна, шырока разгарнуў падрыхтоўку да перавыбараў советаў. Ва ўсіх калгасах і вёсках праведзена растлумачальная работа аб значэнні перавыбарчай кампаніі. Складзен і зацверджан каляндарны план правядзення перавыбараў. Складзены і вывешаны спісы лішэнцаў і, апрача таго, кожнаму з іх паведамлена асобна аб пазбаўленні выбарчых правоў.

У сувязі з падрыхтоўкай да перавыбараў советаў пачаўся масавы прыліў у калгасы аднаасобных гаспадарак. У калгасы ўступілі 23 гаспадаркі з вёскі Санькін Рог і 12 гаспадарак з вёскі Прулок.

Селькор ЧУМАК.

Калгаснікі калгаса імя Дзяржынскага, Менскага раёна, прадаўшы канцэрныі хлеб, купляюць сабе тавары. НА ЗДЫМКУ: выбар мануфактуры у магазіне Строчыцкага сельпо.

Аб рэзультатах і аўдзіце выканання наркаматамі, цэнтральнымі ўстановамі, раённымі арганізацыямі пастаноў СНК СССР аб скарачэнні справаздачнасці

Пастанова ўпаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР

1. Адзначыць, што з боку асобных наркаматаў (Наркомасветы, Наркамзем) і раду центральных і раённых арганізацый (Белкаапсаюз, Белдзяржспірт, Лесбел, крычаўскі райвыканком, касцюковіцкі рэйз, асінавіцкі райвык) было дапушчана грубае парушэнне пастаноў партыі і ўрада аб скарачэнні справаздачнасці, якое выявілася ва ўвядзенні і спуску ніжэйшым органам незаконных форм справаздачнасці.

2. Лічыць зусім недапушчальным дзеянні інспектара Наргасуліку Старадарожскага раёна тав. Львовіча, які, замест рашучай барацьбы за правядзенне ў жыццё па тановы ўрада аб упрашчаванні і скарачэнні форм справаздачнасці і ўліку, сам парушыў гэту пастанову сваім незаконным патрабаваннем ад сельсоветаў вестак, не прадугледжаных зацверджанымі формамі сельсавецкай справаздачнасці.

3. Выяўленыя факты грубага парушэння рашэнняў урада аб скарачэнні справаздачнасці, аб недастатковым кіраўніцтве і кантролі з боку кіраўніцтва Наргасуліку БССР за выкананнем гэтых пастаноў і попрыкрыцця ім больш рашучых мер барацьбы з канкрэтнымі вінаўнікамі парушэння ўчотлай дысцыпліны.

Выходзячы з гэтага пастанаўляе:

1. Дырэктару Белдзяржспірта т. Кузмічову за патрабаванне ад заведуў прадстаўлення незацверджаных форм справаздачнасці—у сувязі з усведамленнем зробленай ім грубай памылкі і абвяшчэнне больш гэтага не паўтараць—абмежаваніца абвяшчэннем яму вымовы.

2. Начальніку ТПС Белдзяржспірта тав. Купоўскаму за спуск заводам шматлікіх і грамоздкіх форм незацверджанай справаздачнасці — абвясціць строгую вымову з папраджаннем.

3. Загалчыку асінавіцкім райвык тав. Цвейфель за шматразовы спуск школам незацверджаных форм справаздачнасці, а таксама за выкананне незаконных патрабаванняў справаздачнасці з боку асобных работнікаў НКАсветы — улічаючы прысутнасць ёю сваёй памылкі — абмежаваніца абвяшчэннем вымовы.

4. Загалчыку Касцюковіцкім райза тав. Янкевічу і б. загалчыку райза тав. Залескаму за сістэматычныя патрабаванні ад калгасаў незаконнай справаздачнасці — абвясціць вымову.

5. Прыняць да ведама заяву намесніка наркамзема тав. Карапеўскага, што ім будзе наложана адміністрацыйнае спагнанне на работнікаў апарата Наркамзема, вінаватых у парушэнні пастаноў СНК Саюза аб справаздачнасці, і што з яго боку будуць прыняты меры да выкарэнення падобных з'яў. Аб выкананні будзе паведамлена ўпаўнаважанаму КСК у пяцідзённы тэрмін.

6. Прыняць да ведама заяву намесніка НКАсветы тав. Лялічыцскага аб тым, што ім будзе наложана адміністрацыйнае спагнанне на ўсіх сваіх работнікаў, патрабаваўшых прадстаўлення незаконнай справаздачнасці, і што з яго боку будуць прыняты меры да выкарэнення падобных з'яў. Аб выкананні будзе паведамлена ўпаўнаважанаму КСК у пяцідзённы тэрмін.

7. Прыняць да ведама заяву нам. нач. УНГУ тав. Капнельсона, што ім абвешчана суровая вымова з папраджаннем інспектару Наргасуліку Старадарожскага раёна тав. Львовічу за яго патрабаванне ад сельсоветаў незаконнай справаздачнасці, а таксама аб тым, што ім будуць даны ўказанні райінспектарам Наргасуліку аб прыцягненні да адказнасці за парушэнне законаў ад справаздачнасці як тых, якія патрабуюць, так і тых, якія даюць незацверджаныя формы справаздачнасці.

8. Прыняць да ведама заяву нам пракурора рэспублікі тав. Глазерава, што ім будзе прапанавана райпракурорам у тэрміновым парадку разглядзець усе пазоўныя ў іх справы на асоб і ўстановы, вінаватых у патрабаванні незаконнай справаздачнасці, а таксама прыцягнуць да адказнасці асоб і ўстаноў, выконваючых незаконныя патрабаванні аб справаздачнасці.

9. Адзначыць, што над відам розных планавых вестак спускаецца патрабаванні на прадстаўленне незацверджаных форм справаздачнасці.

Звярнуць увагу ўсіх кіраўнікоў наркаматаў і арганізацый, што замест таго, каб патрабаваць выканання зацверджанай справаздачнасці, асобныя арганізацыі займаюцца спусканнем уласных, незацверджаных форм, чым ствараюць загрузку работнікаў апарата непатрэбнай работай, лішняе расходаванне паперы і сродкаў і загрузку апарата сувязі. Гэта-ж з'яўляецца ва многіх выпадках прычынай таго, што установы і прадпрыемствы не выконваюць устаноўленую законам справаздачнасць.

10. Заслухаць асобна пытанне аб паўтушэнні пастаноў СНК Саюза аб справаздачнасці Лесбелам, Белкаапсаюзам і крычаўскім РВК.

Ч. в. о. упаўнаважанага КСК пры СНК СССР па БССР
КАМЕНЕЎ М. М.

СЗЯТА РАЗМЕРКАВАЧНЯ УРАДЖАЮ У КАЛГАСЕ „ЧЫРВОНЫ БЕРАГ"

ОРША, 31 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»). 30 кастрычніка вечарам у калгасе «Чырвоны берег», Пішчалаўскага сельсавета, адбылося свята размеркавання ўраджаю.

Старшыня калгаса тав. Багуза, лепшыя ўдарнікі і ўдарніцы калгаса выступілі ля мікрафона і расказалі аб дасягненнях калгаса за год. У калгасе на прападзень падае 2,3 кгр. хлеба, 10 кгр. бульбы, 10 кгр. гародніны і 7 руб. грошай.

Выступленні транславаліся праз радыё па ўсёй Беларусі. У заключэнне была наладжана вячэра, потым танцавалі і гралі.

МІКУЦКІ.

НАШ ВОПЫТ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫСОКАЯКАСНАЕ ВАЛАКНО

(Пісьмо ўдарнікаў і ўдарніц калгаса „Перамога", Сенненскага раёна, БССР)

Таварышы, у гэтым пісьме мы хочам перадаць вам свой вопыт барацьбы за высокаякаснае валакно.

Калі ў 1932 годзе мы здавалі дзяржаве лён у сярэдзіне 4-6 нумарамі, то ў мінулым годзе здалі сярэднім нумарам 9,7, а ў гэтым—12,5. Ніжэй 10 нумара не здалі дзяржаве ні аднаго кілограма.

Што-ж забяспечыла нам перамогу ў барацьбе за высокаякаснае валакно?

Руная пераапрацоўка ільну ў нашым калгасе рабілася ў строгай адпаведнасці з асноўнымі патрабаваннямі агратэхнікі. Аб гэтым мы і скажам больш падрабязна.

Сушка трасты. Што тут патрабуецца? Асноўнае гэта—правільна пасадзіць трасту ў сушню. Нашы сушыльшчыкі рабілі так. Кожны сноп (або, як тут называюць, куль) развязваюць і па жменьках ператрасаюць, каб не было злішнихся жменек. Пагадка робіцца рэдка, так, каб цёплае паветра лёгка пранікала ва ўсе куткі сушні, ва ўсе поры ільну.

Калі лён пасаджэны густа і асабліва вільготны, тады лёгка можа ён запрыцца, псуецца якасць валакна і траціцца яго колер.

Аб дровах. Лепшымі дровамі для сушкі ільну мы лічым вольху і бярозу. Але бяроза тым дрэнная, што яна вельмі каштуе. Для таго, каб валакно не чарнела ад копаці, пакуль не згарыць бяроста не трэба прыкрываць хвояй.

Тэмпература ў сушні павінна падымацца паступова і ні ў якім выпадку яна не можа быць вышэй 60 градусаў. Вільготнае паветра (пара) трэба своечасова спускаць, на пэўны час адчыняючы дзверы. Раней бывала, як толькі высахне тэрэста, мы яе адразу мялі. Гэта пагубна дзейнічае на якасць валакна, на колькасны выхад прадукцыі, бо гарачая тэрэста ў мялцы крашыцца разам са значнай часткай валакна.

Таму мы, як асноўнае правіла, сталі прымяняць адлежку **трасты на працягу 10-12 гадзін.** Гэта павысіла як выхад валакна, так і яго якасць, таму што валакно не секлася зуб'ем мялкі.

Нямалаважнае значэнне мае і правільнае рэгуляванне валаў мялкі. Для буйнейшай трасты валы працюкаюцца слабей (яна лягчэй ламецца), для тробнай—тужэй, яна трутчэй апрацоўваецца.

Цяпер пуск трасты ў машыну. Яе трэба перад гэтым раўнаць прыспускаючы камлямі на лаўцы. Жменькі трасты пускаюцца ў мялку не комам (як гэтага сакуцца верхнія сцяблы, а ўнутры яны аста ніцца непрастучанымі і рэйцамі распластаваныя. Тады перамінанне будзе роўнамерна.

Другім важнейшым агратэхнічным мерапрыемствам пры правільнай перапрацоўцы ільну з'яўляецца адлежка валакна перад трэпкай. Калі зачад мялкі ідзе лён у трэпку, тады таксама, як і пры мяцці сгарачага ільну, атрымліваюцца нізкія адыходы. У нас абавязкова пасля мяцця лён адлежваўся сутки і больш. Здаўмела, гэта зусім не азначае, што валакно павінна стаць вільготным, тады яно таксама дасць нізкія адыходы і не будзе добрай якасці. Валакно павінна адлежвацца ў халодным, але не сырым месцы.

Трапанне ў нас ішло ўдзень і ноччу. Ноччу лён вытрэпваўся начорна, днём—набела. Гэта не толькі паскарала тэмпы, але ў сваю чаргу павышала якасць валакна. Вытрэпаны начорна лён да канчатковай адлежкі некаторы час адлежваўся і набіраў эластычнасць, мех, вату.

Сам трапцак трэпцы таксама па-ўсяму ўплыў. Трапло павінна быць зроблена з мацнага дрэва (клён, дуб, ільмень). Добрыя дуб і ільмень тым, што яны слізкія. Калі трапло з дуба і ільменя апрацоўваецца, на ім з'яўляецца гладкія выступы, якія вельмі добра выцягваюць кастру.

Што яшчэ важна пры трапанні? Удары павінны быць плаўнымі. Асноўнае правіла: **менш біць, больш трасці, ацягваць, гладзіць, перавяршаць.** Тады валакністы палосы застаюцца цэлымі, ношаістымі.

Трэба сказаць проста, што і ў нас быў ніжэйшасны лён (III сорт пры патрэбным пераблечэнні), але мы з яго атрымалі валакно не ніжэй № 10. Гэта—розультат правільнай апрацоўкі на ўсіх стадыях.

І апошняе, што з'яўляецца важнейшым момантам у барацьбе за высокую нумарацыю ільну, гэта—сартаванне трапанага ільну, правільная пазвязка.

Гэтаму мы прыдавалі выключна вялікую ўвагу. Так, і пры агульнай колькасці 50 трапальшчыц у нас трапанала ка сартаванні і пазвязцы 8 чалавек на чале са старшай сартавальшчыцай Дубавец Алесяй.

Якія мэты праследуе сартаванне? Гэта—падбор самага рознастайнага ільну па асобных гатунках. Сартуецца лён па даўжыні і масляністасці, па колеру і цяжару і па вільгаснасці.

Адна вязанка раскладваецца на 10-12 кучак, кожная жменька любоўна аглядаецца і кладзецца не ў агульную кучу, а з'ва сваё месца.

Не менш важны і правільны пазвязць лён. Як-жа гэта робіцца? Лён складваецца ў невялікія вязкі па 2-3 кгр., вісіць шырокая вяроўка і пад макушкі лён тут запрэсваецца ў вязанку.

Пасля сартавання і пазвязкі лён паступае на склад для адлежкі. Праз 4-5 дзён ён здаваўся дзяржаве.

Так мы, захоўваючы асноўныя прыёмы агратэхнікі, дабіліся значных дасягненняў у барацьбе за высокую якасць ільнавалакна.

Мы хочам расказаць і аб арганізацыйных мерапрыемствах, якія стварылі зялёную зацікаўленасць работай на ільне, стымулявалі ўдарніцтва і забяспечылі, побач з высокаякаснай апрацоўкай ільну, высокія тэмпы ільнозагатаўкі дзяржаве.

Першае. Выдача хлеба, атрыманага за аданы лён, толькі на ільняных працадні. Мы выдавалі аванс па 1 кгр. мукі на кожны працадзень, выпрацаваны на ільне. Выдача рабілася кожную пяцідзённку. Пяцер-жа, калі разлічыліся з дзяржавай па ільну і атрымалі за лён хлеб, мы яго зноў-жа выдаем толькі тым, хто працаваў на ільне. На працадзень прыпадае 2 кгр. хлеба.

Другое. У нас **практыкавалася штодзённае прэміраванне лепшых ударніц па трапанню.** Норма ў нас —8 кгр. на дзень, за што налічваецца 2 працадні. За перавыкананне нормы мы кожны дзень на тварку абвяшчалі імёны прэміраваных. Прэміі былі 2-3 рублі кожнай трапальшчыцы, узамен грошай выдаваліся прамтавары.

Вось нашы лепшыя трапальшчыцы-ўдарніцы, якія дасягнулі нормы 15 кгр. у дзень: Ісаранка Марфа, Гурына Ганна, Казалёўская Ганна і рад іншых. Яны штодзённа атрымлівалі прэмію.

Трэцяе. На таку ў нас выходзілі насценныя газеты, заклікаўшыя дошкі помпаў. У калторы калгаса вялася ганаровая спісы лепшых ударніц.

Вось кароткі аб тым, што рашыла наш поспех, што дало права лічыцца нашаму калгасу перадавым у раёне і нават у рэспубліцы. Нядарма-жа рад лепшых ударнікаў і ўдарніц калгаса прэміраваны Наркамземам БССР, а калгас атрымаў грузавую аўтамашыну.

Перапраўляем вам, таварышы, свой вопыт і чакаем пісьма ад вас з абмеркаваннем вопыту вашай работы.

З калгаснымі прывітаннем:

Старшыня калгаса «Перамога», Сенненскага раёна, БССР
Н. КАСАЛЕЎСКІ.
Нам. старшыні па ільну
І. АРЛІКОВСКІ.
Бухгалтар: ВАЛУЕВ МІХНОВІЧ КАСАЛЕЎСКІ, ДУБОВЕЦ.
Сартоўшчыца — вяк па ільну ў брыгадзе № 1—ЛУБАВЕЦ АЛЕСЯ.
Ударнікі-трапальшчыцы: ПІСАРОНКА МАРФА, ГУРЫНА ГАННА, КАСАЛЕЎСКАЯ ГАННА, КАЗЫРЭЎСКАЯ ГАННА, КАЗЫРАЎСКАЯ САРЫЯ, КАВАЛЕЎСКАЯ СРОСЯ, МІХНОВІЧ МАРЫЯ, МАРКАВЕЦ ХРЫСЦІНА, САЛАЎЕВА СЁКЛА, ДУБАВЕЦ НАДЗЕЯ І ДУБАВЕЦ ВОЛЬГА.

„АБ ІЛЬНОЗАГАТОЎКАХ І С М КРЫТЫЦЫ"

«Палеская праўда» (Тожель) прысвячае гляду друку «Аб ільнозагатоўках і самакрытыцы» («Звязда» за 28 кастрычніка) перадавы артыкул, у якім піша, што

«ЦО КП(б)Б «Звязда» ў сваім агляде дала рэзкую крытыку работы рэдакцыі «Палескай праўды». Гэта крытыка зусім правільная. Наша задача — выправіць свае памылкі і разгарнуць дзейсную большэвіцкую крытыку і самакрытыку, не зважаючы на асобы. Гэтаму нас абавязвае і рашэнне ЦК ВКП(б) аб гомельскай арганізацыі».

У рэдакцыйнай заўвазе да агляду «Палеская праўда» піша:

«Рэдакцыя «Палескай праўды» лічыць, што крытыка «Звязды» нашай работы правільная.

Рэдакцыя на старонках «Палескай праўды» не забяспечыла аператыўную работу па ільнозагатоўках, не выкрыла канкрэтных вінаўнікаў арыву гэтага важнейшага абавязацельства перад дзяжавай. Мы таксама не выкрылі і не падвергілі большэвіцкай крытыцы дзейную работу кіраўнікоў раённых арганізацый, якія непасрэдна ведаюць гэтай справай: загалчыка гэраз тав. ЖДАНОВІЧА, дырэктара МТС тав. ВАЛЮКЕВІЧА і загалчыка «Заготільну» тав. ДРАГУНСКАГА, якія не забяспечылі аператыўнага кіраўніцтва ільнозагатоўкамі і ільнопрацоўкай.

Выпраўляючы свае памылкі, рэдакцыя ў дапамогу вызнай рэдакцыі пасылае на вёску ашчэ 7 работнікаў.

Агляд «Звязды» будзе абмеркаваны на партколе рэдакцыі з мэтай прыняцця канкрэтных мер па далейшаму разгортванню большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі».

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

У ПЕТРЫКАВЕ ПАКРЫВАЮЦЬ ЖУЛІКАЎ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Братковускі, Агародны, Анікейчык—вось група злачынцаў і п'яніц, якая кіруе асавіцкім сельсо Петрыкоўскага раёна.

Тавары, якія яны атрымліваюць для пайшчыкаў, сістэматычна перапрадаюць кулакам за хабар і гарэлку. Калгаснікам-жа заўсёды адказваюць: ніякіх тавараў няма, не атрымалі яшчэ». Такім парадкам разданы чыгуны, вёдры і другія тавары заможнікам Судзібару, Прохаразу і Дубецкі.

Дакуль-жа ў асавіцкім сельсо будуць працаваць спекулянты, падкулачнікі?

ЮНІЦКІ.

**

ПЕТРЫКОЎ (ад палескага карэспандэнта «Звязды».

Старшыня асавіцкага сельсо Агародны і яго намеснік Анікейчык лічаць свайго прадаўца Братковускага незаменным спецыялістам па гандлю. Гэтай думкі трымаецца і райспажыўсаюз.

Из самой-жа справы Братковускі вяўляецца заўзятым ашуканцам спажыўцоў і растратчыкам прамадскіх сродкаў.

У асавіцкай крамі бо працуе ўжо тры гады, кожны год робіць растраты і ўсё-ж яго пакідаюць працаваць і далей. Растрачаныя-ж сумы кожны раз спісваліся. У гэтым выгарэлі растратчыка Агародному дапамагаў і старшыня рэвізійнай камісіі пастачэнік Курдо.

Братковускі со свайго боку пазабаве «задзякаваў» рэвізору і старшыні сельсо. Калі скончылася рэвізія, у кватэры Агароднага была арганізавана вячэра з выпіўкай. Размаўляючы рукамі, п'яны рэвізор Курдо, які, да рэчы, лічыць сябе сельторам, ганарыў Братковускім: «Мы зрабілі так што і камар носа не падточыць, а за гэта выпіем ашчэ па шклянцы».

Так быў прыкрыт раскрадальнік дзяржаўнай маемасці Братковускі.

Хто ён гэты Братковускі? Гэта былы спекулянт, злодзей. Працаваў у 1926-27 гг. у сярыгалаўскім сельска - гаспадарчым таварыстве па закупцы жывёлы, Братковускі рабіў так: купляў карову або вала для таварыства, а потым 5-6 раз выменьваў на другіх і ўсё барышы клаў сабе ў кішэню. Такім чынам ён фармальна лічыўся совецкім служачым, а па сутнасці быў заядлым спекулянтам.

Працуючы прадаўцом, Братковускі ў першую чаргу адпускае тавары кулакам і заможнікам. Чыгуны і вёдры, прыдбаныя на закупку хлеба, Братковускі прадаў «сваім людзям»—Галецкаму Васілю і інш. Рыбу, прыдбаную для стымулявання закупак яек, прадаваў проста на грошы.

Сельпо закупае ў сялян суцэльныя жалуды па 75 кап. за кілограм. Братковускі сялянам грошай за прынесеныя жалуды не плаціць, а узамен іх прымушае браць «рускую горкую». Так асавіцкае сельпо выконвае план тавараабароту.

Р. ФРАЛОЎ.

Па слядах выступленняў „Звязды"

„У ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЁНЕ ЦКУЮЦЬ БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ"

«Звязда» пісала з жніўня пра выключэнне начулых і бюракратычных адносінаў лепельскіх раённых і сельсавецкіх арганізацый да чырвонаармейскага калгаса і яго старшыні і рахунавода былых чырвонаармейцаў комуністаў тт. Чудзеснікава і Камарова.

13 жніўня Лепельскі райком партыі абгаварыў выступленне «Звязды». Прынятае райкомам па гэтай справе рашэнне было бязгубым, абыходзячым канкрэтных вінаўнікаў у адносінах над былымі чырвонаармейцамі. «Звязда» прымушана была 22 жніўня яшчэ раз выкрыць да Лепельскай справы. У сваім рэдакцыйным артыкуле «У Лепелі не любяць самакрытыкі» мы рашэнне райкома назвалі «небольшэвіцкім, гніла-ліберальным рашэннем, замазваючым усю палітычную сутнасць справы».

Сёння мы змяшчаем пастанову партколегіі Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б) па БССР, якая поўнасцю пацвярджае факты і высунутыя намі Лепельскаму раённаму партыйнаму кіраўніцтву абвінавачанні. Адначасова мы змяшчаем сёння і вытрымкі з пастановы бюро Лепельскага райкома КП(б)Б, у якой прызнаюцца цалкам правільнымі нашы першае і другое выступленні па справе былых чырвонаармейцаў Чудзеснікава і Камарова.

Гэтымі пастановамі вінаватыя ў адносінах над былымі чырвонаармейцамі, Хамішчанка, Гарамык, Смірноў, Расказаў і іншыя, прыцягнуты да крымінальнай і партыйнай адказнасці. Райкомам прыняты меры да знаходжання калгасу канкрэтнай дзейснай дапамогі. Але гэта не ўсё.

Галоўны вывад, які трэба зрабіць з усёй гэтай справы, гэта той, што ўсякая спроба адмовіцца ад самакрытыкі, замазаць зробленую палітычную памылку немінуча вядзе да новых, яшчэ больш грубых памылак. Галоўны вывад той, што трэба **стварыць такія ўмовы ў раёне, пры якіх кожная смерта працоўнага, кожны сігнал другу сустрэлі б самы куткі, чулы і вычарпальны адказ.**

Гэты вывад для сябе павінен зрабіць не толькі Лепельскі, але ўсе райкомы партыі Беларусі.

З ПАСТАНОВЫ ПАРТКАЛЕГІІ КПК ПРЫ ЦК ВКП(б) ПА БССР ПА АРТЫКУЛУ „ЗВЯЗДЫ"

У ЛЕПЕЛЬСКІМ РАЁНЕ ЦКУЮЦЬ БЫЛЫХ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

Прыпадаўшы артыкул «Звязды» «У Лепельскім раёне цкуюць былых чырвонаармейцаў» поўнасцю пацвердзіўшымся, партколегія Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б) па БССР **пастанавіла:**

1. Сакратару Лепельскага РК КП(б)Б тав. Хіжанкову і старшыні РВК тав. Замокрыну за непрыняцце мер па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню чырвонаармейскага калгаса, за несвоечасовае разгляданне на незаконныя дзеянні раённых арганізацый у адносінах да былых чырвонаармейцаў Чудзеснікаву і Камарову — **абвясціць вымову.**

2. Прыняць да ведама, што старшыня Балясоўскага сельсавета тав. Хамішчанка за адзеі над Чудзеснікавым і Камаровым пастановай райкома партыі **з работы знят, выключан з партыі і аддан пад суд.**

3. Абмежавацца пастановай райкома аб абвяшчэнні суровай вымовы з папраджаннем начальніку Лепельскага раённага аддзела НКВД тав. Расказаву і начальніку райміліцыі тав. Гаравіку за грубейшае парушэнне рэвалюцыйнай законнасці, выразіўшаяся ў беспадстаўных арышце Чудзеснікава і Камарова.

4. Райпракурору тав. Смірнову за несвоечасовае разгляданне па парушэнне рэвалюцыйнай законнасці (дапушчэнне ўтрымання арыштаваных Чудзеснікава і Камарова ў арыштным памяшканні да 7 дзён) — абвясціць суровую вымову.

5. Прыняць да ведама, што райкомам партыі прыняты канкрэтныя меры па аказанню практычнай дапамогі к выпрацоўцы мацнуюся ладаходнаў у кіраўніцтве добраасяленчаскім чырвонаармейскім калгасам імя Дзяржынскага.

„У ЛЕПЕЛІ НЕ ЛЮБЯЦЬ САМАКРЫТЫКІ"

Бюро Лепельскага РК КП(б)Б, абмеркаваўшы выступленне «Звязды» «У Лепелі не любяць самакрытыкі», прызнала яго палкам і поўнасцю правільным. Прызнана таксама, што бюро РК у сваёй ранейшай пастанове не дало правільнай большэвіцкай ацэнкі фактам, ускрытым «Звяздой» у матэрыяле «У Лепельскім раёне цкуюць былых чырвонаармейцаў».

Арышт былых чырвонаармейцаў, — гаворыцца далей у пастанове РК — з'яўляецца выпікам прытуплення большэвіцкай пільнасці з боку членаў бюро РК тав. Расказава, начальніка міліцыі тав. Гаравіка і пракурора тав. Смірнова.

І, нарэшце, бюро РВК прызнала сваё рашэнне ад 12 жніўня па матэрыялу «Звязды» «У Лепельскім раёне цкуюць былых чырвонаармейцаў» **«небольшэвіцким, несамакрытычным і гніла-ліберальным у адносінах да непасрэдных вінаўнікаў учынкаванні і арышце т.т. Чудзеснікава і Камарова.** Рашэнне гэта з'явілася рэзультатам прытуплення класавай рэвалюцыйнай пільнасці, у рэзультаце **адсутнасці большэвіцкай самакрытыкі з боку райкома і, у першую чаргу, з боку яго сакратара тав. Хіжанкова».**

Бюро РК пастанавіла:

Адмяніць сваю ранейшую пастанову па справе траўлі былых чырвонаармейцаў Чудзеснікава і Камарова, як палітычна памылковую.

Галоўнага і непасрэднага вінаўніка ў адзеках над тт. Чудзеснікавым і Камаровым старшыню Балясоўскага сельсовета Хамішчанку з работы зняць, выключыць з партыі і аддаць пад суд.

За беспадстаўны арышт і утрыманне пад вартай Чудзеснікава і Камарова абвясціць суровую вымову з папраджаннем начальніку райаддзела НКВД тав. Расказаву і начальніку райміліцыі тав. Гаравіку.

Суровая вымова абвешчана таксама намесніку ўпаўнаважанага НКВД тав. Карчаку і райпракурору тав. Смірнову.

Абвешчана таксама вымова намесніку сакратара РК КП(б)Б тав. Ванцыраву, які начуў, не на партыйнаму адыйсця да справы арышту комуніста Камарова.

Нарэшце бюро РК указала тав. Хіжанкову — сакратару РК, што ён недапусціў палітычнай нядбасці падчаркнутых у «Звязды» фактаў і не даў на бюро РК гэтай справе выразнай большэвіцкай ацэнкі.

Бюро РК прапанавала ўсім парторгам прапрацаваць у брыгадах і на агульных сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў артыкул «У Лепелі не любяць самакрытыкі» і перадовы «Звязды» аб самакрытыцы.

АДКРЫТАЕ ПІСЬМО ВСФК ПРЫ ЦВК БССР

НАРКОМАСВЕТЫ, НАРКОМАТУ АХОЗЫ ЗДАРОЎЯ, ДЗЯРЖПЛАНУ, ПРОЛЕТСТУДУ, ЦСПСБ, ДЫРЭКТАРАМ ВНУ І ТЭХНІКУМАЎ

Фізкультурны рух Беларусі дасягнуў вялікіх поспехаў у справе ахопу шырокіх мас працоўных фізічным выхаваннем.

Значныя зрухі мы таксама маем і ў справе ўмацавання фізкультурнай работы ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах і перш за ўсё на лініі акадэмічнай часткі.

Аднак, гэтыя дасягненні нязначныя і прадстаўляюць сабой толькі першыя крокі, якія не могуць нас задаволіць і перш за ўсё з якаснага боку. Пры агульным росце фізкультуры ў нашай рэспубліцы ВНУ і тэхнікумы далёка адсталі і не займаюць тое месца, якое яны абавязаны займаць. Усё гэта з'яўляецца прычынай таго, што праграмы па фізкультуры не выконваюцца ў большасці ВНУ і тэхнікумах. Па агульнаму становішчу совецкі студэнт абавязан да скончэння тэхнікума здаць нормы на ГПА першай ступені, а студэнты ВНУ — на другую ступень. Не гледзячы на гэта, з агульнай колькасці 10.600 чал. па ВНУ і 20.000 чал. у тэхнікумах здала нормы на комплексу першай ступені 8.284 чал. або 27 проц. і ні аднаго чалавека па другому комплексу.

Не лепшая справа з вучэбнымі гадзінамі па фізкультуры ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Асабліва гэта адносіцца да ВНУ Наркомасветы і Наркомата аховы здароўя. Ма[illegible] сярэдніх зоо і нават больш гадавых гадзін па фізкультуры, гэтыя гадзіны расстаўляюцца зусім няправільна і ставяцца ў раскладах там, дзе ёсць вольнае месца. Так, напрыклад, у хімфаку ВДУ ёсць 30 гадавых гадзін па фізкультуры. Кіраўніцтва факультэта ўмудрылася да таго, што ў верасні ўставіла ў расклад 20 гадзін, астатнія 10 гадзін будуць відавочна размяркоўвацца на ўвесь год, а работнікі медінстытута яшчэ «лепш зрабілі» і вынеслі вучэбныя гадзіны па фізкультуры за сетку вучэбных заняткаў. скарацілі колькасць вучэбных гадзін з 90 на 40. Такія выпадкі не адзіныя.

Імкненне кіраўнікоў ВНУ выкінуць з сеткі фізкультурных гадзін нельга нічым апраўдаць, і гэта адбываецца з прычыны таго, што ў гэтых ВНУ справу фізічнага выхавання забюракрацілі, зрабілі гэта простым урокам, простай дысцыплінай, не маючай, па іх думцы, ніякага значэння.

Зусім кепска абстаіць справа з вучэбнымі памяшканнямі для заняткаў па фізкультуры. З 8 ВНУ на Менску толькі 3 маюць залы, якія не могуць забяспечыць нават 50 проц. усёй патрэбнасці. Так, напрыклад, у зале інстытута народнай гаспадаркі разам з ВПІ займаюцца 70 вучэбных груп. Гэта складае 4 вучэбныя групы на гадзіну. Не гледзячы на гэты зусім недапушчальны факт, кіраўніцтва гэтых навучальных устаноў ніякіх мер не прымае. Больш таго, некаторыя інстытуты ператварылі фізкультурныя залы ў інтэрнаты для студэнтаў (БДУ). Многія-ж інстытуты замест падшчэння фізкультурных залаў для заняткаў, абмяжоўваюць фізкультурную работу правядзеннем фізкультурнай зарадкі, што ў корані пярэчыць устаноўленаму палажэнню аб фізічным выхаванні ў навучальных установах.

Дрэнна абстаіць справа з фінансаваннем фізкультурнай работы. Так, напрыклад, у БДУ расходы па фізкультуры ўключаны ў агульны каштарыс расходаў на студэнта, што не можа забяспечыць студэнта як асабістым, так і агульным спортінвентаром.

Усё гэта не можа не адбівацца на якасці вучэбнай і спартыўна масавай работы ў нашых вышэйшых і сярэдніх навучальных установах. Хіба не ганьбай з'яўляецца для кіраўніцтва вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, што мы не маем ні ў адной навучальнай установе БССР з ліку студэнтаў добрай футбольнай каманды, добрых лёгкіх атлётаў, лыжнікаў, канькабежцаў і другіх відаў спорта з рэспубліканскімі і нават саюзнымі дасягненнямі.

У такой ВНУ, як інстытут народнай гаспадаркі, дзе налічваецца 1.500 студэнтаў, ёсць толькі дзве валейбольныя каманды і гімнастычная секцыя, а медінстытут не мае ні адной каманды па спартыўных іграх. Такое-ж становішча мы маем у політэхнічным інстытуце, у сельскагаспадарчым інстытуце ў Горках і характэрна для другіх вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў рэспублікі. На спартыўных спаборніцтвах каманды ВНУ і тэхнікумаў прадстаўляюцца ў адзінкавых выпадках, займаючы ў сілу ніякай спартыўнай тэхніці апошнія месцы. Зусім недапушчальным з'яўляецца той факт, што па гэты дзень ні адна ВНУ, ні адзін наркамат не выкананы рашэння камітэта вышэйшай тэхнічнай асветы аб стварэнні пры ВНУ вузкамісіі і камітэта па кіраўніцтву фізкультурнай работай пры наркаматах.

Трэба таксама адзначыць адсутнасць усякай увагі да пытанняў фізкультурнай работы ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах з боку пролетстуда ЦСПСБ.

Такое становішча з пастаноўкай фізкультуры ў навучальных установах у далейшым не можа быць цярпімым.

Дзе прычыны такой слабай, у асабліва ў лініі якасці, пастаноўкі фізкультурнай работы ў навучальных установах? Прычыны крыюцца ў тым, што мы маем у наяўнасці прамую недазвалёнку і супраціўленне да ўкаранення фізкультурнай работы ў навучальных установах з боку кіраўніцтва цэлага раду вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, якое не знаходзіць адпаведнага адпору ад усіх арганізацый, у веданні якіх яны знаходзяцца.

У сілу гэтага фізічная культура ў большасці ВНУ і тэхнікумах як абавязковая дысцыпліна яшчэ не заняла роўнацэннага месца ў сістэме агульнаасветных дысцыплін.

Вышэйшы совет фізкультуры ставіць перад кіраўніцтвам вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў і арганізацыямі, у веданні якіх яны знаходзяцца, наступныя пытанні, выкананне якіх павінна забяспечыць рэзкі ўздым усёй вучэбнай і спартыўнай работы ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах.

1. Стварыць пры наркаматах камітэты па кіраўніцтву фізкультурнай работай у навучальных установах, а пры ўсіх ВНУ і тэхнікумах — вузаўскія камісіі па фізкультуры.

2. Увесці ва ўсіх навучальных установах вучэбныя гадзіны па фізкультуры ў агульную сетку раскладу заняткаў і прыцягнуць да адказнасці тых кіраўнікоў, якія парушаюць гэта палажэнне.

3. Стварыць пры ўсіх ВНУ і тэхнікумах моцныя спартыўныя калектывы на ўсіх відах спорта, стварыўшы ім усе ўмовы для трэніроўкі і павышэння спартыўнага майстэрства, забяспечыўшы іх удзелам у правадзімых спаборніцтвах па летніх і зімовых відах спорта.

4. Правесці зімой гэтага года першую зімовую спартакіяду вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў па ўсіх відах зімовага спорта.

5. Карэнным чынам палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу для разгортвання фізкультурнай работы (залы, душы), дабіваючыся таго, каб навучальныя ўстановы мелі свае лыжныя базы, каткі і адпаведны спортінвентар як асабістага, так і агульнага карыстання студэнтаў.

6. Склікаць у снежні месяцы ўсебеларускую нараду па пытанню пастаноўкі фізічнага выхавання ў навучальных установах.

7. Устанавіць, што кіраўнікі ВНУ і тэхнікумаў адказваюць за фізічнае выхаванне ў такой-жа меры, як і за другія дысцыпліны.

Усе гэтыя задачы патрабуюць неадкладнага вырашэння з тым, каб ужо ў бліжэйшы час дабіцца такога становішча, пры якім фізічнае выхаванне ў навучальных установах было б узнята на ўзровень задач, што стаяць перад фізкультурным рухам у справе выхавання ўсебакова фізічна развітых людзей.

ВНУ і тэхнікумы могуць і павінны на аснове совецкай сістэмы «ГПА» вырасціць сотні і тысячы майстроў совецкага спорта.

Старшыня ВСФК пры ЦВК БССР
ЗАКОЎСКІ.

ДА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

Ад „Северо-Западного края" да БССР

Па высаджанай і вытаптанай дарозе паміж незданых, аголеных зімою хмызнякоў цягнецца жалобная працэсія. Затурканая кляча, якую даўно ўжо чакае жывадзёрня, ледзь цягне, напружваючы апошнія сілы, старыя раскудлачаныя сані, на якіх ляжыць неабчасаная і такая-ж раскудлачаная труна. Наперадзе — стары селянін з насівелай барадой у грубай абдзёртай світцы, горбіцца пад цяжарам вялікага чорнага крыжа. За труною двое хлапчукоў з растрывожанымі і пашаросламу сур'ёзнымі тварамі, падтрымліваюць палажыстую жанчыну. Яна шагае, як заведзены механізм, у яе вочы і твар апухлі ад слёз, пасмы радзенькіх валасоў павісвіліся з-пад хусткі і трапеталі на рэзкім прадвясновым ветры. А з горла яе вырываюцца не словы, а сапраўднае выццё, нейкае жудаснае чаргаванне высокіх і нізкіх нот, чалавечай і звярынай роспачы. І далёка разносіцца гэтыя, спіскаючыя сэрца гукі, паступова замірочы ў нямой безабсалютнасці памярцвелых хмызнякоў і бялюднага поля.

Хутка вясна. Прыдзе вясна шумліва, рупліва, блискучая. Усе будуць ёй радавацца, усе зробяцца кібіта маладзейшымі ад зіхатлівых праменняў вясновага сонца, ад пругкіх павеваў вясновага ветрыку. Але не выйдзе ўжо зраты на пачаўшелы свой шнур, не будзе больш аглядаць сваю сяву, драўляную, лыкам вязаную барану, не будзе варочакамі падпіхаць разпеалы дзедаўскі яшчэ хамут — не будзе. І не давядзецца яму скідаць шапку перад суседзям сваім, што, жыве ў новай крытай гонтай хаце, ні перад панам старжнікам, ні перад панам старшынёй, ні перад панам лясніком.

Колькі іх было гэтых паноў над захудалым, сядзельным мужыком «Северо-Западного края». Старшыня, староста, поп, дзяк, карчмар, крамнік, бліжэйшы сусед, у якога хлеба хапае далей як да Юр'я... У ніцідзеслых гадах сантыментальны абшарнік Дунін-Марцінкевіч ня разгортваў перад мужыком бл кучы малюнак будучыні.

Мужык будзе не скаціна —
Не раз скажа пан з панёю:
— Пане Грышка, пане Міша,
Як-жа, васпан, ці здарову?

Афіцыяльная тэрміналогія «Северо-Западного края» ў адносінах да селян не ведала спецыяльнага тэрміна для звароту. Гэта было «палагное сословие», якое было навек прыкавана да сваёй бярлогі, якому трэба было патрацціць шмат сіл і энергіі для таго, каб атрымаць нават «временный увольнительный билет», каб найсці на яміі заработкі, калі ўжо ямлі канчаткова сходзілася клінам.

Пампа араты, стараста наведамляе ў воласць, воласць паставіць у гра фе смяротнасці лішнюю адзінку, волаемаць пойдзе ў павет, у губерню, у сталіцу, а ў сталіцы вучоны даследчык запіша у сваю працу:

«Несмотря на улучшающееся материальное положение, смертность среди крестьянства Могилевской губернии увеличивается. Причину этого нужно искать, очевидно, в преобладании растительной пищи».

Вы ведаеце, таварышы, што гэта за «растительная пища». Гэта лебяда, гэта тоўчаная кара, гэта сухая прамёрзлая журавіна, якую карміўся ўвесну селянін «Северо-Западного края».

Выходзіла калісці ў Менску паскудненькая газета «Минское слово». Але становішча селян «Северо-Западного края» не магла замоўчаць і гэта друкаваная праститутка. У № 413 за 1908 год нейкі «Путник» апавядае:

«Проезжая я посетил село Дубровку, Минского уезда. Из всего, что меня особенно поразило — это алчность некоторых местных торговцев. Торговцы эти (лавочники) уже до того измельчали, что не гнушаются вести торговлю даже таким продуктом, как росол или селедка, который местные жители называют «ёк». Крестьяне живут очень бедно и иметь такую роскошь, как селедку, они на могут, так как она очень дорога, 4-5 копеек—да и не хватит одной селедки на семью а есть нужно что-нибудь есть. Не есть же в самом деле постоянно один сухой хлеб нужно же хоть чем-нибудь разнообразить свой и без того скудный стол. Поэтому крестьяне покупают «ёк» за стоимость ложку которого платят одну копейку, разбавляют его водой, мякают в него хлеб или картофель и так едят».

«Путник» мусіць ніколі не прабаваў селядцовага дёку, калі так абурыўся на «алчность некоторых торговцев». Але ці прабаваў ён хоць той хлеб, з якім «мужички» елі гэты «ёк»?

Айцы горада і добрамысныя земскія дасяны з вёдаю, кошчыкамі пальцаў толькі дакраналіся да таго, што было хлебам для мільёнаў падуладных им людзей. Іх сэрцу сёмга і балык у акварыуме гаварылі многа больш, чым хлеб з пацоўчанай карэ, а іскраметная «удава Кліко» многа больш перакоквала, чымся разведзены вадою селядцовы «ёк». І пад гукі новай шансанеткі, якой-небудзь мадэмуазель Флаўрэтыні ім было ўжо зусім не да таго, што **«по слухам голодовка в Слуцком уезде принимает острый характер. Так, говорят, что один из земских начальников уведомил, что в его участке есть места, где второй день у крестьян нет ни крошки хлеба. Между тем о прибытии продовольственного хлеба поныне ни слуху ни духу, если не считать нескольких поступивших в земскую управу дублинатов накладных на хлеб, принятый на очереди».**

Далёка ехаць хлебу ад Омска да Слуцка.

Але многа бліжэй ураднику і стражніку да пакурчанай голадам вёскі. Там памярцвелыя твары дзяцей і жанчын, там коней пасуць, трымаючы за аброць, каб не ўвалеці на спрочны кавалак зямлі, якім улазе вальможны пан Ваньковіч ці Сянтаполк-Мірскі. Там вецер жыве ў коміне, як сабака, і мароз пранізвае да касцей на пяналенай печы. І там над кожнаю хатаю, як жудасная адзіна вісіць «нядоімка». «Кесарава кесарэві» гутнявіць кругленькі бацюшка. І вось прыходзіць «кесарава слуга» з бляхамі і «селядцамі» і забіраюць апошнюю карэўку—адзіную надзею маткі і дзяцей. І тады бывае так:

«В Церковской волости Слуцкого уезда при столкновении крестьян с полицией, оказывавшей содействие при взыскании сборов, выстрелами стражи убито трое и ранено трое крестьян; у одного стражника переломана рука. На место происшествия выезжали уездный губернией и прокурор».

Звоняць малінавым звонам бомы над дугой—гэта едуць пан упраўляючы губерніяй і пан пракурор па Слуцкім бальшаку. Заміраюць высокія і нізкія ноты ў заледзянелым горле ўдавы на панурай дарозе паміж хмызнякоў. Вы спазніліся, пане ўпраўляючы губерніяй! Калі вы прыедзеце ў Парафіяльную воласць, камы ямлі ўжо змёрзнуцца і арыштуцца ў магіле аратага. Не варта траціць часу: масленіца надыходзіць.

Паліцэйская аркадыя

Паручнік Гарталаў напісаў у «Окраіну», што паручнік Сулімоўскі стаіць на чале «лігі свободной любві», што ліга гэта складаецца з вучнёўскай моладзі і мае назвычай дасылаць арганізацыю. Паручнік Сулімоўскі ў «Минском слове» заявіў, што гэта інсінуацыя і абраза, якая можа быць змыта толькі крывёю. Менск, Вільня і Пецярбург падымаюцца на дыбы, пацеюць чыноўнікі, трызуцца газеты—і ў канцы аказваецца, што ні Гарталаў, ні Сулімоўскі нічога не пісалі, а ўсё гэта не больш, як польска-яўрэйская штрыка.

Румынская спявачка з рэстарана «Европа» звяла нямаведама дзе.

У вечары па Губернатарскай вуліцы пранеслася чутка, што сярод гуляючых з'явілася жанчына ў модных жаночых шараварах. У момант сабраўся велізарны натоўп. Да вяліся выклікаць спецыяльны наряд гарадавых і трое самых цікавых з публікі затрыманы для напісання пратакола. Жанчына, аказваецца, была толькі ў модным вуркал суконны. Падвяла.

Прыехаў Міхаіл, біскуп менскі і турэўскі. Сустракалі са звонам. Зварачала на сябе ўвагу адсутнасць пана начальніка губерні. Чыноўнікі трывожна перашэптваюцца.

Гармонія поўная. Аркадыя сапраўдная. Над тоўстаю мордаю гаўдавога злаецца рэюць беласнежныя крылы каляднага херувіма. Нешта ёсць летуценнае ў гэтай апухлай мордзе, у гэтым цмым носе і аранжавых вітых пацлеўніках. Нездарма гэтым тоўстазадым анёлкі з «селядцамі» круцяць год служаць аб'ектам найчуллейшай увагі самога начальніка губерні:

«Вчера в помещении стражников, по Александровской улице, по примеру городской полиции, устроена была ёлка для стражников. Кроме приглашенных гостей праздновство посетил г. начальник губернии».

Раскормленыя «анёлкі»—гэта апора трону, іх трэба берагчы. Дзе іх выпісваюцца спецыяльныя пашпорты, якіх не бяре пякая рэвальверная куля. Цяпер крамольнікам крышка. «Православие, самодержавие и народность» могуць спакойна осці балык і гуляць з гімназісткамі. Кроў змываецца цёплай водой, блясхь ачышчаецца тоўчаною цэглою або крэйдаю, сцены ў турме глухія і высокія, нитля робіцца са звычайнай вяроўкі і намыльваецца мылам. Жыцце ідзе заведзеным парадкам; не ўсё-ж «лібералы» такія небяспечныя. Гэта толькі социял-демакраты «патрасаюць устои» і хочуць вывернуць іх к чортавай матэры. Гэта толькі яны парушаюць строяную гармонію паліцэйскай Аркадыі і праз іх бравым гарадавікам трэба надяваць пацяпляемыя пальцы. Вяр'ма беларускі «пісьменнік» Пінчелка, якога так міла расхваляў другі «пісьменнік» Максім Гарэцкі ўжо ў нялёгкія годы пісаў у віленскім «Крестьянине» з гордай горыччу:

«Черносотенец должен все терпеть, все сносить. Человек, преданный родине, слышит нападки, клеветы на русское слово, на русскую власть, человеку этому подсовывают разного рода сногсшибательные прокламации, ему не дают проходу по улицам демонстративные шествия с красными флагами, останавливают его детей, ходящих в школу, заставляют бестовать его прислугу, держат в осаде весь его дом,—словом, доводят его до белого каления своим нахальством, неслыханной дерзостью.

И все это должен терпеть «черносотенец».

Бедны Пінчолка. Пакрыўджаны, у канец загнаны гарэзнымі рабочымі, бунтоўнымі селянамі, злымі пальмкамі, нехрысцімі з гетто шляхетны рыцар чорнай сотні.

Трывожны час для «Северо-Западного края». Пагражаюць мачуць заводы, бурліць вёска. Усе шукаюць нейкага выхаду з замкнутага кола ўсеагульнага змярцвення. Буржуазныя лібералы з «Нашай нівы» бачаць гэты выхад. Ён—за ўзбагачэннем. «Наша ніва» друкуе самыя пераканаўчыя табліцы, якія даводзяць, што хутары вешальніка Сталыпіна—адзіны шлях да добрабыту.

«Хто мае больш жыцёлы, у таго і ўрадзяй лепшы і грошы больш пойдзе да кішэні.

Але пытанне ў тым, як падрымаць гаспадарку? Дзе дастаць патрэбную лічбу жыцёлы? Хто тут выйдзе на дапамогу вёсцы і яці?»

Гэтага «Наша ніва» і сама гэтага не ведае,—артыкул у нумары 37 за 1906 год яна гэтым і заканчвае. Сыцела была ў дварах Чапскіх, Радзівілаў, Шафнагелаў—але хіба магла «Наша ніва» сказаць селянам, што трэба забраць жыцёлу, забраць зямлю ў Чапскага, у Радзівіла, у Шафнагеля, у «шчырых» беларусоў, якія робяць ласку часам прачытаць не старонкі і ўспомніць, што яны з'яўляюцца патомкамі старых беларускіх родаў?

Над паліцэйскай Аркадыяй уадымаўся трупны цах. Пахла крывёю замучаных людзей, пахла тленам загніваючага кутра яшчэ жывых забойцаў. І не хапала толькі адзнаго паху—таго, пра які пісаў вялікі бунтар Генрых Гейне:

«Хто вельмі многа смярдзе?
пры жыцці
Па смерці прыемна пахне».

Але ўжо надыходзіла апошняя мяжа і для гэтай катэгорыі.

З Менска першая іскра

У апошнія дні лютага і першыя дні сакавіка 1898 года менскі паліцмейстэр не знаходзіў сабе месца. Паліцэйскія часы вырвана чуп пах пейкай крамолы, але паліцэйскія мазгі былі занадта нізкімі для таго, каб учуць адкуль ідзе гэты пах. З Пецярбурга, з Кіева, Цэнтральнай Расіі, з Пазаволжжа прагучаў трывожны сігнал гарадавым усёй імперыі. На гэты раз не ідэалістычнае «хождение в народ», не беспаспяховыя спробы пасобных групак інтэлігенцыі,—сапраўдны, баспушны, але напорны і нязгінны рух мільёнаў. Над зіхатлівою стражніцкаю ёлкаю падняўся пагражаючы цень новай магутнай сілы—пролетарыята.

Увечары 1 сакавіка прыехаў з-ід Часці Антон Кандрацьевіч Прачэнчык спакойна праходзіў па Захар'еўскай вуліцы на Залатую Горку. Ён паволі прайшоў праз мост, важна адказаў на прывітанне паставога гарадавога на Шпітальнай вуліцы, перайшоў на левы бок і рушыў уздоўж маленькіх сядзелапаватых хатак уверх. На вокнах весялі дзіцячыя фіранкі, з-за фіранак выглядалі «благанадзежныя» герані і фуксіі, перад вокнамі перагарані і фуксіі, перад вокнамі перагарані і пляталіся кусты пантовага бэзу і губернскай акацыі. Ціш ды гладзь... І міма дома № 125 прыехаў прайшоў зусім ужо безуважна. Нават не шоў зусім. Ну як магло ўлезці ў дуплавую башку царскага служ ні што бовую башку царскага служ ні што бовую башку царскага служ ні что ўсіх гэтым пачцівым мяшчанскім куточку запальвоцца першы агонь чык таго полымя, у яго праз 19 годоў загарыць і сам прыехаў і «Северо-Западный край» і ўся Расійская імперыя?

Але грымеў над светам голас Леніна, ужо адкрыўся ясны і просты шлях да ўсіх, хто шукаў гэтага шляху.

І вось на руінах былога «Северо-Западного края» з'яўляецца першы, нелялічкі яшчэ атрад барацьбітоў за новую будучыню гэтага краю, усіх яго працоўных, на якой-бы мове яны ні гаварылі.

Большэвік Фрунзе вядзе салямскі з'езд у Менску.

Большэвік Фрунзе—гэта частка ўсяго рэвалюцыйнага пролетарыята, адзін з байцоў яго перадавога атрада. Ён, без лішніх дэрмонцій адрывае маскі з кожнага і паказвае, што пад маскаю шчырасці і прыхільнасці хаваецца звярыны твар ворага.

— Якое дачыненне да салямскага з'езда мае арганізацыя, на чале якой стаіць буйнейшы абшарнік Смірмунт, і ў складзе якой ёсць і ксяндзы, і чынаўнікі, і землеўласнікі, але няма ніводнага селяніна. А між тым усе яны называюць сябе социялістамі. Хто можа паверыць у ксяндза-социяліста, у абшарніка-социяліста? Гэта проста шэнская інтрыга.

І калі Окцюр суровымі рукамі рабочых і салдат скінуў з рахунку прагарэўшых ігракоў, — тады ясна стала, за кім стаіць праўда. «Вольная Беларусь» высунула ясную і ясцім для не натуральную праграму:

«З большэвікамі трэба змагацца дзеля таго, што яны рыхтуюцца завесці ў дзяржаве такі грамадзянскі ład, да которага людзі яшчэ не дарасілі. Уводзіць у нас, пры нашай гаспадарскай і грамадскай адсталасці, социялістычны ład, — гэта ўсё роўна, как хто захацеў з малога хлопца раптам зрабіць дзяцюка ды стаў-бы цягнуць яго за вушы ўверх. Разумеецца, апрача калецтва, з гэтага нічога-б не вышла. А тым часам большэвікі робяць нешта падобнае з дзяржавай Расійскай, і мы бачым, што скуткам іх заўчаснай чынносці лабольшэвіцца бязпад, напатніма і заняпад».

Дык далей, далей ад гэтай новай Расійскай дзяржавы, якая ўздымае гарэзную руку на маёнткі пана Скірмунта, якая знайшла згульную зразумелую мову для ўсіх прыгнечаных былой турмы народаў Расіі, для ўсіх нарэшце і зямлі.

Як пекалі Ластоўскі да Гіндэнбурга і Людэндорфа, — так цяпер Лёсіх і Скірмунт зварачаюцца да найвышэйшага шэфа—самога Вільгельма. Пачынаецца пышны фарс дыпламатычных мемарандумаў, надзвычайных дыпламатычных місій. На ўсёй Еўропе развозяць «народныя міністры» свой тавар — дабро і працу беларускіх рабочых і селян, аднаўдаючы нечуваныя банкі пра свою сілу, багацце і ўладу і выпрошваючы адпаведны аванс.

Але рукі ў гэтых нялоўкіх шулераў былі далёка не такімі чыстымі, як многіх з іх хацелі потым паказаць.

У канцы 1919 года ў Менск заглянуў начальнік польскай дзяржавы Пілсудскі. У гарадскім тэатры, пераўбоўнем бліскучымі прадстаўнікамі буржуазіі Менска, дзяўчаткі з белых сукенках надносілі пану маршалку белыя і чырвоныя кветкі. І здавалася, што на гэтых кветках заквітнелае гарачыя эгуэткі крыві беларускіх рабочых і селян, крыві разгромленай хуткай сялянскай бяды; на іх адбівалася зарава недалёкіх пажарышчаў, апошнія языкі полымя дагараючых вёсак. І за пасамі, якімі віталі начальніка дзяржавы, чуўся стогн паміраючых, прадсмяротны хрып забітых панам маршалкам. Але пазт Прушынск выступіў з гарачым прывітаннем «вызваліцелю» беларускага народу. Ён заклікаў яго весці і далей справу «вызвалення» беларускага народу ад «маскоўска-большэвіцкай навалы». Пан начальнік ласкава дазволіў энтузіясту-паэту пачаць фармаванне спецыяльнага «беларускага войска».

Але працоўныя масы Беларусі ведалі ўжо, за кім яны павінны ісці. Насенне, кінутае большэвікамі Фрунзе, Мясніковым, Кнорыным, Пазэрнак, трапіла ў плодную глебу і заняло ўжо буйнаю руніну пажараў і пустэчаў, суровай і бязлітаснай партызанскай вайны. Рабочыя і сяляне Беларусі беспаваротна пашлі за большэвікамі. Краіна, дзе азгарэлася першае вогнішча большэвіцкай партыі, павінна была зрабіцца і зрабілася не моцным апло тым. І калі акружная Чырвоная армія дала высцятка маршалкавай раці, дык на ўцёкі «беларускага войска» хапіла пары вагонаў. Пабіцце за «заміншаныя званіцы Смаленска» не ўдалося.

Белыя рукавічкі беларускія нацыяналісты надзявалі толькі пры ўрачыстых спатканнях з людзьмі, маючымі грошы і моцную руку. У абыдзенным жыцці яны абыходзіліся без рукавічак. Яшчэ ў 1919 годзе «вялікі камбінатар» палкоўнік Базівітаў жанраўся на бесправоўнага канцлера «генерала» Булак-Балаховіча. «Генерал» аказаўся «свядомым беларусам» і нават... паетам, які піша вершы па-беларуску. «Палкоўнік» хутка паралумнуся з крывавым «паэтам» і дрыжачку яго «вамандзіром асобнага атрада БНР у Эстыі».

Спаленыя, разгромленыя мястечкі, павешаныя, закатаваныя людзі, згвалтаваныя жанчыны. Дзікія оргіі страшэнных чалавечых вобразаў пражэжнікаў, жудасныя расправы з безабаронными і бяссільнымі ўцёкі перад узброенымі рабочымі і селянамі Беларусі — вось шлях крывавага генерала «паэта».

Ці мала яшчэ спроб рабілі апэратачныя дзеячы, каб зноў адкуціць сваё рукі ў гарачую чалавечую кроў. «Армія» Некрашэвіча падала, слушнае «наўстаўнае» ляпчыла, замежныя аматары нажывы ўбачылі, што справа дохлая, што тут ні шалера не заробіш. Куды толькі не кідаліся «высокаідэйныя» дзеячы БНР. Усюды, дзе толькі шалеяла валюта, з'яўлялася мясі, заключалі ўмовы, прадавалі ўсё патрэбнае пакупку без торгу (а тавар забіраце самі!) і рвалі, рвалі без канца крадзіныя білеты і акцыі, звонкую манету і далікатныя абяцанні. І з кожным годам усё слабей і слабей падымаліся мутныя бурбалкі на паверхні смярдзючага балота еўрапейскай палітыкі аж пакуль зусім не зніклі. І разам з імі пайшлі на дно апошнія цені колішняга «Северо-Западного краю», неадрыўным элементам якога яны з'яўляліся.

Пад гармонік

Мы ідзем па нядаўна выбрукаванай дарозе. Яшчэ гадоў дзесяць таму назад, калі наша рэспубліка толькі пачынала ўкапоўвацца, гэта дарога была толькі зімовай. У дзёгку ўлавеснае, жудаснае балота гатоў было засмактаць і чалавека і каня — трэба было ганяць у аб'езд недзе не ў два разы больш. Цяпер на балоце строгімі чорнымі лініямі праходзяць дрэнажныя каналы, якія высмоктваюць рэзную балотную кроў і спускаюць яе ў старажытную, зарослую зарам і трысцём рэчку.

Нядаўна прайшлі дождзі і па ўзбочынах шасе дзе-ні-дзе трапляюць на дужыны. Мой спадарожнік уважліва глядзіць пад ногі, выбірае большыя каменні — яму шкада зашпурнуць свае новыя боты. Ён дыра нуты з трубаватай прэтэнзіяй на элегантнасць, але яго сінія галіфе і карычневы фрэнч недзе дапасаваны да яго вобразу жыцця. Яны, блясцяшчае, стараннае вычышчаны, але галоўнае ў іх — гэта тое, што яны дапамагаюць свайму гаспадару эканоміць рухі і час для апранання. Яму няма часу займацца больш рупліва сваім гуардэтам.

— Уся мая брыгада, — на хутарах, — кажа ён. — Трохі стальпінскіх, трохі прышчапаўскіх. Цяпер крыху крапчай стала, а вось першы год тут гэта было. Тут у нас было трохі балахоўнаў напрыклейвалася. Ну, дык на старой памяці, школдзіці як маглі. Гады было на кідограму абожжа на працадзень, цяпер да чатырох дабіваемся. А з бручкай, з морквай не ведаем як і рабіць. Не інакш, давялецца спінаферму пашырыць.

Мы заходзім у хату да брыгадзіра. Хата абстаўлена яшчэ не па гарадскому, але і не па-старому — стол стаіць ужо не на традыцыйным месцы ў кутку, а бліжэй да акна на вуліцу. На покках, у бляшанках з-пад кансерваў стаяць свежыя палявыя кветкі, а з кутка строга пазірае на хазяіна Клімент Ефрэмавіч.

— Не ведаеце, калі выйдзе другая частка «Поднятой целины»? Цікава, як яно там далей пойдзе.

На вакне я заўважаю грулоя кніжак. Гэта «Что делать» Леніна, некалькі палітычных і папулярна-сельска-гаспадарчых брашур, рэдактаваная і ў канец зачытаная вазма Купалы «Над рэкой Арэсай».

Сягоння выдатны дзень: канец вясновай сяўбы. Калгас выканаў сваё задалёнае рэўна ў армію; учора зрокам закончылі апошнюю бульбу. А сягоння мабілізаваны гарманісты, школьнікі напрыхтавалі над кіраўніцтвам настаўніцы невялічкую п'есу.

Над вечар на вуліцы таўчэцца пажылая моладзь і памалодзеўшыя старыя. Недзе ўжо зайграў гармонік. Яго калісці вельмі не любілі інбезкультурныя «спецыялісты», бо гэта «не нацыянальны інструмент», бо пад гармонік лепш за ўсё спяваюцца «брыдкія заволокія частушкі».

А пад гармонік так весела скакаць і так шчыра пяецца пра сваіх герояў і такі звонкі смех выклікаюць грубаватыя, але вострыя жарты пра суседзяў на раллі.

Ленінская руні

Бронзавы Ільіч са сталай трыбуны перад Домам урада ў Менску пераводзіць пяшчотным поглядам стадзянцкую моладзь, якая спакаецца з усіх бакоў на універсітэцкі гарадок. Строгія карпусы яго чыны расселіся кругом, як акадэмікі на прыёме ў старшыні ўрада і выглядам сваім робяць мачуллую справу ладу.

80 год ішлі ў «Северо-Западном краю» гутаркі пра вышэйшую навучальную установу. З 1842 года на гэтай велізарнай тэрыторыі не была ніводнай установы. Два дзесяткі ВНУ працуюць зараз на тэрыторыі БССР, падрыхтоўваючы тысячы спецыялістаў для перабудаванай гаспадаркі.

Глядзіць бронзавы Ленін на крыху, дзе над вёскаю пандэмаўскага святой Еўфрасіні і патрыміцкага святога Гаўрыіла цвілі побач з жудасным перамаганам патрасаючага бескультурнасці і жахлівая бедзнасць, і перад яго вачыма ўстаюць высокія карпусы пока-пабудаваных і перабудаваных заводаў, якія аўсём змянілі твар гэтай краіны.

Асіпавічы, Гомсельмаш, Крычаўсельгазмаш, Гомельскі шкловавод, Магілёўская шаўковая фабрыка, Барысаўскі дрэваапрацоўны камбінат, ільнокамбінат у Оршы, «Пролетарыі» ская перамога» ў Барысаве — гэтыя тое, чаго не было і не магло быць у «Северо-Западном краю». Гэта магутная ленінская руні, гэта буйныя ўсходы таго зярна, якое з першым дзён Окцябра засяваюць сейбіты партыі Леніна на закінутых гонях былога «Северо-Западного краю». Даремна былі людзі, якія не г рыдалі ў свае сілы, і даремна былі людзі, якія западта верылі ў свае сілы. Даремна нацыянал-дэмакратычны бард Дубоўка складаў паскрыпі менскіяя заводы—іх гудзі заглушыць яго славесное выццё.

З былых саматужніцкіх майстэрняў вырастаюць гіганты прамысловасці. На касцях Сальманаў, Данаў, Поліякаў, Рубінаў вырастае чырвонасцяжны завод «Большэвік» — трэці па велічыні ў Савэце, заводзім Варашылава, на якім працуе больш рабочых, чым на усіх 53 «заводах» Менска дзацішь гадоў таму назад. На квазэрну лепшага ўдарніка завода «Большэвік» былога «нарадпа» так. Канапацкага прыходзіць не гарадавы, не прыстаў з вобыскам а пазтм і наркомы. Яны прыходзяць гарбату і вядуць з ім доўгім такія размовы, якія дзацішь гадоў таму назад пяліся толькі сямым знатнымі людзьмі ў цёпы багатых, абстаўленых лачытанымі кнігамі габінетаў.

У 1914 годзе ўся кніжная прадукцыя на беларускай мове складала ся з 20 назваў — сюды ўваходзілі календары на ўсе годы, сельска-гаспадарчыя брашуркі, якія ішлі пагодным тытулам «навуковых кніг» камплекты газет. Яшчэ столькі-ж назваў чорнасотніцкай нарматрыбі — вось і ўсё, што выходзіла тады на тэрыторыі «Северо-Западного краю». А сягоння ў мільёнах адбітакаў расплываюцца па БССР творы Леніна, Сталіна, Маркса, Горкага, Гёгэ, Гейне. Газета і тэатр у глухім мястэчку, бліскучы клуб для бяспраўнага калісці гарадскога рабочага: «Северо-Западном крае» клубам для яго была толькі турма.

Перад вачыма бронзавага Леніна прабягаюць звонкія трамваі і закла почаныя аўто. Раніцою перад ім та рохам рассыпаецца вясёлая дастава, для якой гудуць у краіне заводы і па дальніх марах плывуць ка раблі, рушацца горы і плаваюцці ільды. Яны напаўняюць сабою школы — і гэта для іх аддавалі жыцці героі Перакопа, Сібіры, Украіны. Гэта для іх не спіць начамі вялікі правадыр працоўных усяго свету Сталін і гэта да іх гаворыць пра вялікія перамогі бронзавы Ленін з высокай сваёй трыбуны. Яны шчаслівыя, яны не ведалі жахлівага балота «Северо-Западного краю» і працоўстамордых «архангелаў» ведаюць толькі з кніжкі. Нашаму пакаленню дана было бліскучае шчасце барацьбы і перамогі, іх пакаленню дана вялікае шчасце будаўніцтва.

Мерна шагае перад бронзавым правадыром калона чырвонаармейцаў. Спагадна праводзяць іх вачыма рабочы, з павагаю глядзіць на строгіх іх рады калгасніц, з пруглушчанай нянавісцю пазірае захаваны ворак услед варашылаўскім гадавацям. Наша краіна, якая стаіць на рубяжы старога і новага свету, з'яўляецца баявым фарпостам вялікага Совецкага Саюза. Моцна стаіць яна на варце новага свету, пільдуе хлеба ў яе над хатамі. І ніколі не бетанчць ужо з-над абноўленай гэтай зімні жахлівыя прыміты «Северо-Западного краю».

АЛ. ДУДАР.

На магіле „Северо-Западного края"

Вайна цяжкою пятою прыдушыла народы і, здавалася, над яе пажарам назаўсёды заглухлі ўсе жывыя галасы. Лібкнехі складаў у крэпасці, нямецкія і французскія социялісты павыперадкі, стараліся выслужыцца перад сваёю вашчынчаю, рускія меншавікі трымалі фронт перад усерасійскім гарадавым. Усё ішло так, як належыць, пакуль рэвалюцыйны выбух не абляпіў усе карты: не вытрымаў самадзержаў усерасійскі і ўсё пайшло к чорту. Распалася старая пасудзіна, якая называлася Расійская імперыя, і распаўся ўвесь бруд, які ў ёй быў. Падняліся наверх усе нечысці—самая пара лавіць рыбу ў мутнай вадзе.



Новыя дамы для рабочых у Менску.

НЕЛЕГАЛЬНАЯ ПРОЛЕТАРСКАЯ ПРЭСА ГЕРМАНІІ.

НА ВЫЯВЫ: нумар газеты «Салідарнасць» органа германскай секцыі М-ж рабпом, распаўсюджваемы ў Германіі. Газета надрукавана драбнейшым прыфтам на папіроснай паперы і мае 8 старонак маленькага фармату.

АРЫШТЫ СЛУЖАЧЫХ ПАУПРЭДСТВА СССР У БЕРЛІНЕ

БЕРЛІН, 2 лістапада. (БЕЛТА). Гэтымі днямі агентамі тайнай дзяржаўнай паліцыі былі арыштаваны два служачыя паўпредства СССР у Германіі — абодва германскія грамадзяне, упраўляючы домам паўпредства СССР Найтке і шофер паўпредства Фінлайзен. Абодва працуюць у паўпредстве звыш 10 год. Арыштаваны яны былі на-за будынкам паўпредства. Прычыны арышту пакуль невядомы. Паводле чутак, арыштаваным прад'яўляецца абвінавачанне ў падрыхтоўцы да «дзяржаўнай здрады». Паліцыя прабуе тэрарызаваць астатніх нямецкіх супрацоўнікаў совецкіх устаноў, каб прымусіць іх пакінуць службу.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЕ ГАНДЛЁВАЕ ПАГАДНЕННЕ

БЕРЛІН, 2 лістапада. (Белта). Учора падпісана новае валютнае пагадненне паміж Германіяй і Англіяй. Пагадненне дасягнута пасля доўгіх перагавораў у рэзультаце вялікіх уступак з боку Германіі. Германія прынцыпова абавязваецца выдаваць германскім імпарцёрам без абмежаванняў валютныя ліцэнзіі для ўвозу ўсіх відаў тавараў з Вялікабрытаніі. 2 сумы, выручаемай за экспарт Англію, Германія павінна выдаліць 55 проц. для аплаты англійскага экспарта ў Германію. Затым Германія абавязваецца неадкладна выдаліць не менш 100 тыс. фунтаў стэрлінгаў для пагашэння часткі сваёй камерцыйнай задоўжанасці Англіі. Поўнасцю гэта задоўжанасць павінна быць пагашана не пазней чым праз год, прычым для гэтай мэты Германія павінна выдаліць 10 проц. сумы, выручаемай ёю за германскі экспарт у Англію.

Наадрэце, Германія абавязваецца поўнасцю аплачваць пасля 1-га студзеня абавязацельствы па пазыках Дауэса і Юнга, якія знаходзяцца на руках у брытанскіх трымальнікаў. Пагадненне гэта ўступіла ў сілу 1-га лістапада 1934 года. Яно можа быць аднабакова расторгнута к 1-му лістапада кожнага месяца з папярэджаннем за 1 месяц.

РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ БАРАЦЬБА У ІСПАНІІ ПРАДАЎЖАЕЦЦА

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (БЕЛТА). Паведамленні іспанскіх карэспандэнтаў буржуазных газет пацвярджаюць, з усіх бакоў, што барацьба ў Іспаніі прадаўжаецца. «Пці парыз'ен» паведамляе, што з гэтага часу казармы грамадзянскай гвардыі будуць ператвораны ў маленькія крэпасці з кулямётамі і радыёсувязю.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ ПАУСТАННЯ У АСТУРЫІ

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (БЕЛТА). Друк змяшчае падробязнасці паўстання ў Астурыі. Паўстанне падрыхтоўвалася ўжо даўно. Рабочыя аружэйных фабрык сістэматычна выносілі зброю са складаў сваіх прадпрыемстваў і хавалі яе ў патаемных месцах. Было прадугледжана, што інжынеры будуць забяспечаны ўсім патрэбным і ім будзе прапанавана прадаўжаць кіраваць тэхнічнай стараной вытворчасці на прадпрыемствах: такі-ж меры меркавалася прадпрыняць у адносінах да лакгаўзаў.

У адным з загадаў рэвалюцыйнага камітэта гаворыцца: «Паведамляецца, што створана чырвоная гвардыя пры ўдзеле ўсіх рабочых, якія гатовы абараняць сваю кроўю інтарэсы пролетарыяту. Гвардыя будзе кіравацца наступным чынам: 1) усе рабочыя ад 18 да 35 год могуць уступіць у яе рады. 2) яны павінны захоўваць жалезную дысцыпліну. 3) дэзертыры і тоўсы будуць сурова карацца. 4) усе асобы, належачыя да эксплаататарскіх класаў, не маюць права ўступаць у рады чырвонай гвардыі».

У часе паўстання ўсе будынкі ў Овіедо былі ўпрыгожаны чырвонымі сцягамі і малюнкамі серпа і молата.

«Юманітэ» друкуе злымак іспанскай манеты, на якую астурыйскія рэвалюцыянеры нанеслі серп і молат. Такія манеты былі ў хаду ў тых раёнах, дзе была створана рэвалюцыйная ўлада.

ЛІХАМАНЧАВАЕ УЗБРОЙВАННЕ ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (БЕЛТА). Газеты паведамляюць, што Германія прадаўжае ліхаманкава ўзбройвацца. «Матэн» піша, што Германія змагла б за некалькі дзён мабілізаваць 90 пяхотных і 8 кавалерыйскіх дывізій, якія з патрэбнымі атрадамі складзі-б армію звыш 2 млн. чалавек.

РАЗГАЛОССІ ЎНУТРЫ ФРАНЦУЗСКАГА УРАДА

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (БЕЛТА). Учора ўвечары разносіліся чуткі аб ямавітасці адстаўкі кабінета Думерга, бо перагаворы Думерга з Эрыо і прэзідэнтам не выявілі магчымасці кампраміса. Сёння ўвечары адбудзецца тэрміновае пасяджэнне совета міністраў пад старшынствам прэзідэнта Лебрэна, прысвечанае праекту рэформы канстытуцыі, прапанаванага Думергам.

Думерг патрабуе: 1) узмацнення улады прэм'ера і стварэння пры прэм'еру асобага кабінета; 2) прадстаўлення ўраду выключнага права прапаноўваць расходныя артыкулы бюджэта, прычым палата і сенат будуць пазбаўлены гэтага права; 3) права прадаўжэння ў парадку дэкрэта бюджэта бягучага года на наступны год, калі палата не прыме бюджэта ў наложаны тэрмін; 4) забароны права стачак для дзяржаўных служачых; 5) права роспуску палаты ўрадам і назначэння новых выбораў без узгаднення з сенатам.

Асноўныя разгалоссі паміж Думергам і радыкальнымі міністрамі ідуць імённа па апошняму пункту. Думерг згадзіўся абмежаваць права роспуску палаты двумя выпадкамі: калі ўрад атрымае меншасць у палаце ў першы-ж год пасля парламенцкіх выбораў і калі на працягу 6 месяцаў будуць скінуты два ўрады. Радыкал-сацыялісты да гэтага часу не далі згоды на прадастаўленне ўраду права роспуску палаты нават з гэтымі абмежаваннямі.

«Юманітэ» сігналізуе, што фашысцкія элементы мабілізуюцца для рашучых выступленняў. Газета нагадвае масам радыкальнай партыі аб катэгарычных выступленнях нізавых делегатаў на канцэрнскім кангрэсе супроць замаху на грамадзянскія правы і аб патрабаванні роспуску і разгаўвання фашысцкіх арганізацый.

ХТО ПАДТРЫМІВАЕ ХУ ХУЗАУ

ХАВАРАЎСК, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). Згодна атрыманых з Манчжурыі вестак, на станцыі Шытоўхецзы Усходняй лініі КУЧ, зусім легальна пражывае група хунхузаў, на чале з нейкім Сіншунам. Японска-манчжурскія ўлады прадаставілі Сіншуну і яго штабу памяшканне і ўсклалі на мясцовае «гандлёвае таварыства» абавязак поўнага снабжэння яго атрада. Сіншун грабіць мясцовае насельніцтва і трымае яго пад страхам. Уладам ён абяцаў спыніць шкоднічтва паміж станцыямі Шытоўхецзы і Галінцзы, г. зн. у мясцовасці, быўшай раней раёнам найбольш частых крушэнняў. Ён не спяшаецца, аднак, адкрыта гаварыць, што калі перагаворы ў Токіо скончацца нядачай, ён зноў будзе атрымліваць плату ад японцаў за работу па наладжанню крушэнняў.

Гэта паведамленне, атрыманае з даставерных крыніц, цікава супаставіць з нядаўнай крыклівай кампаніяй японска-манчжурскай прэсы, распаўсюджваўшай недарэчныя сцвярджэнні, быццам хунхузы, якія нападалі на паязды КУЧ і наладжвалі крушэнні, былі арганізаваны і атрымліваюць падтрыманне ад совецкіх служачых КУЧ, многія з якіх, як вядома, у сувязі з гэтым былі арыштаваны.

ПРЫЕЗД ГАЛАНДСКАЙ РАБОЧАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

НЕГАРЭЛАЕ, 3 лістапада. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Сёння ў СССР прыехала галандская рабочая делегацыя для ўдзелу ў Окцябрскіх урачыстасцях у Масскве, у складзе 10 чалавек, у тым ліку 2 жанчыны. Узначальвае делегацыю рабочы-горнік тав. Прус. Сярод делегатаў — тэкстыльшчык, гарняк, партовы рабочы, аднін селянін і інш. Усе яны выбраны на сходах рабочых буйнейшых фабрык і заводаў Амстэрдама, Дортрэста і інш. гарадоў.

У Негарэлым галандскіх таварышоў сустракалі мясцовыя рабочы-чыгуначнікі і калгаснікі.

На лятучым мітынгу галандскіх гасцей віталі старшыня мясцкома чыгуначнікаў Якушоў і брыгадзір рамонту вагонаў тав. Мялешка.

Замежныя госці прабудуць у СССР месяц.

СОВЕЦКІЯ СПАРТСМЕНЫ ВЯРНУЛІСЯ З ЧЭХАСЛАВАКІІ

НЕГАРЭЛАЕ, 3 лістапада. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Сёння прыехалі совецкія спартсмены, якія варочаюцца назад пасля трохтыдневага прабывання ў Чэхаславакіі.

У Негарэлым спартсменаў сустракалі прадстаўнікі ВСФК СССР тт. Грыгор'еў і Леў, сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Стукалаў, нам. старшыні ВСФКБ тав. Кузняцоў, адказны сакратар таварыства «Дынамо» тав. Розін і інш.

У гутарцы са спецкорам «Звязды» кіраўнік делегацыі тав. Харчэнка заявіў:

— Паліцэйская праваканыя ў Кошыцах была зроблена з мэтай замазаць велізарныя поспехі совецкіх фізкультурнікаў і паражэнні буржуазных спартыўных клубаў.

У Кошыцах 9 совецкіх лёгкаатлетаў трымалі над арыштам трое сутак, пасля чаго яны былі высланы з Чэхаславакіі.

На германскай граніцы чэхаславацкі паліцэйскі перачаў совецкіх фізкультурнікаў і пражэнні буржуазных спартыўных клубаў.

У Кошыцах 9 совецкіх лёгкаатлетаў трымалі над арыштам трое сутак, пасля чаго яны былі высланы з Чэхаславакіі.

На германскай граніцы чэхаславацкі паліцэйскі перачаў совецкіх фізкультурнікаў нямецкай фашысцкай жандармерыі, якая безадкладна іх арыштавала і адвяла ў турму, дзе яны знаходзіліся на працягу шасці гадзін да адыходу поезда на Варшаву.

Арышт совецкіх фізкультурнікаў выклікаў вялікае абурэнне сярод рабочых Чэхаславакіі. У Кошыцах рабочыя наладзілі дэманстрацыю з воклічамі: «Няхай жыве Совецкі Саюз!».

М. КІН.

АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЗНАХОДКА У ОРШЫ

28 кастрычніка вучань 1-й сярэдняй школы гор. Оршы Мядзведаў Трафім прынёс у школу адну невялікую частку згрэмаленага клыка не вядомай жывёлы.

У сувязі з гэтым мясцовыя жыхары расказваюць, што яшчэ зімой гэтага года ў лясчанай каляіне каля в. Кабылякі, у двух кілометрах ад Оршы, экскаватарам быў выкапан шкілет невядомай дагістарычнай вялізнай жывёлы. Шкілет спарахнеў і рассыпаўся на часткі. Гэта знаходка заслугоўвае ўвагі археолагаў.

МІКУЦКІ.

Новы ўзорны фруктовы магазін на Ленінскай вуліцы (Менск).

ПРАДСВЯТОЧНЫ БАЗАР У МЕНСКУ

Загадчык гарадскога аддзела ўнутранага гандлю тав. Саф'ян паведаміў нашаму карэспандэнту.

— Па рашэнню Менскага гаркома КП(б)Б і горсовета 4 і 5 лістапада арганізуецца прадсвяточны базар, у якім прымуць удзел калгаснікі і аднаасобнікі Менскага, Пухавіцкага, Лагойскага, Дзяржынскага, Смалявіцкага і Заслаўскага раёнаў.

Актыўна рыхтуюцца гандлёвыя арганізацыі, якія выставяць тавары на суму больш мільёна рублёў. Гандаль у асноўным будзе разгорнут на новым Чэрвеньскім рынку і старым рынку на плошчы Парыжскай Камуны.

Будуюцца новыя ларкі, падвозіцца тавары. Гарком партыі накіраваў у сельсоветы Менскага раёна ўпаўнаважаных для масава-палітычнай работы сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў.

НОВЫ ВАРШТАТ ДЛЯ ЗАТОЧКІ ФРЭЗЕРАЎ

ВІЦЕБСК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Стары рабочы завода «Чырвоны металіст» тав. Пржэводскі вынайшаў новы варштат для заточкі фрэзераў. У параўнанні са старым варштат тав. Пржэводскага паскарае заточку фрэзераў у два разы і ва многа раз палепшае якасць заточкі. Варштат пушчан ужо ў ход.

У бліжэйшы час варштаты канструкцыі Пржэводскага будуць вырабляцца ў масавым парадку.

ЗАРУБЕЖНЫ.

ЗЛЁТ ЗНАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ СКОНЧЫЎ СВАЮ РАБОТУ

На рашэнным пасяджэнні 3 лістапада пачаліся спрэчкі па дакладах тт. Розіна і Мархашова.

Выступалі лепшыя ўдарнікі лесарубы Рагачова, Парыч, Віцебска, сплаўшчыкі Петрыкова, Чачэрска, Полатчыны, старшыні калгасаў, навуковы работнікі, рабочы запалкавай фабрыкі, каніфольнага завода, старшыні рабачкомаў саюзаў, дырэктары дэспрамтасаў і інш. Усяго выказалася 45 чалавек.

На вячэрнім пасяджэнні з вялікай прамовай выступіў загадчык прамыслова-транспартнага аддзела ЦК КП(б)Б тав. Готфрыд.

Злёт паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б) — тт. Сталіну і Кагановічу, Саўнаркому СССР — тав. Молатаву, Наркомлесу — тав. Лобазу, ЦК КП(б)Б — тав. Гікало, СНК БССР — тав. Галадзеду і ЦВК БССР — тав. Чарвякову.

Злёт прыняў зварот да усіх рабочых лясной прамысловасці БССР.

УСПАМІНЫ СТАРЫХ БОЛЬШЭВІКОЎ ПРА ОКЦЯБР

Беларускім таварыствам старых большэвікоў перад святкаваннем XVII гадавіны Окцябрскай рэвалюцыі праводзіцца рад сустрэч-гутарак з піонерамі, комсамольцамі і дарослымі рабочымі Менска.

29 кастрычніка член таварыства старых большэвікоў тав. Сіманчык правёў гутарку з піонерамі поўнай сярэдняй школы аб тым, «Як я стаў большэвікам да Окцябрскай рэвалюцыі». У школе № 21 тт. Сіманчык і Орнэхоўскі правялі гутарку з вучнямі аб рэвалюцыйным руху да Окцябра і грамадзянскай вайне. Старыя большэвікі выступалі са сваімі ўспамінамі перад рабочымі будаўнікамі ЦЭЦ, рабочымі гарадской электрастанцыі, вучнямі 23 і 12 школ і інш.

Сёння член таварыства старых большэвікоў тав. Ашан на агульнагарадскім зёлце моладзі, які прысвечан XVII гадавіне Окцябра і перавыбарам совецкіх, расказа аб тым, як арганізаваліся першыя советы.

ВЫКАНАЛІ НАСТРЫЧНІЦКУЮ ПРАГРАМУ

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

Панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ» выканала дзесяцімесячную праграму на 106 проц., кастрычніцкую — на 105,4 проц.

Змагаемся за павышэнне якасці прадукцыі і датэрміновае выкананне гадавога плана.

Дырэктар фабрыкі МАРУШКІН.
Сакратар парткома ЛЕУТАЎ.
Старшыня фабкома БАРЫНАВА.

* Фізіка-матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўносіць на пабудову агітзвяка імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў 263 р. 80 к. і выклікае наследаваць яго прыкладу астатнія факультэты БДУ, медінстытут і педінстытут.

РАМАШКА.

* Калектыў рэдакцыі плешчаніцкай раённай газеты «Барацьбіт за калектывізацыю» ўнёс на пабудову агітзвяка самалётаў імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў 50 руб., селькоры Акалоўскага сельсавета—31 руб. 50 кап., Хатаевіцкага сельсавета—40 р. 50 к. Селькоры тт. Шабан, Данілевіч і Варэнік унеслі па 10 руб. кожны.

КУЧЫНСКІ, КЛІМОВІЧ.

* Рэдакцыя перахаўскай раённай газеты «Ударнік калгасаў» сабрала на пабудову агітзвяка 86 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

«Ударнік калгасаў»—ФАРБЕРАЎ.

* На пабудову агітзвяка па гор. Віцебску сабрана 1.400 руб., з іх на шчаўінаму камбінату 272 руб., фабрыцы «КІМ» — 332 руб., уздор 701 — 250 руб., сплаўчанторы—100 руб., акулярнай фабрыцы — 150 р., рэдакцыі «Віцебскі пролетарый» — 300 руб.

ПІМШТЭЙН.

ПАПРАУКА

У паведамленні аб выпуску інжынераў - ізраргенетыкаў, надрукаваным ва ўчаранішнім нумары «Звязды», пры пералічэнні лепшых работ выпускніку выпадкова выпала работа тав. Крачкоўскага «Газагенератарная станцыя змешанага газу на Уралмашзаводзе».

ПАВЕДАМЛЕННЕ

У сувязі з святкаваннем XVII гадавіны Окцябра аддзел культуры і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б пранапуе перанесці заняткі партыйнай і комсамольскай сеткі з 5 на 9 лістапада.

Заг. аддз. культ. і прапаганды ленінізма Менгаркома КП(б)Б ВАРОНЧАНКА.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

6 лістапада 9-7 гадзін вечара, у памяшканні яўгэйскага Дзяржаўнага Тэатра (вул. Валадарскага,

адбудзецца

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

прысвечанае 17-ай гадавіне Окцябрскай рэвалюцыі.

На пленум уваходзяць па сваіх мандатах: члены і кандыдаты горсовета, члены ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, члены ЦВК і СНК СССР і БССР, упаўнаважаныя камісій партыйнага і совецкага контролю, члены Бюро ЗГК КП(б)Б і ГК ЛКСМБ, члены прэзідыума ЦСПСБ, члены таварыстваў старых большэвікоў.

Астатнія таварышы праходзяць па спецыяльных запрашальных білетах, якія можна атрымаць у арганізаваным аддзеле горсовета (пакой № 49, тэлефон № 23-983).

Прэзідыум Менгорсовета.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 5 лістапада

Гукавы мастацкі фільм, прамяваны на міжнародным выставуцы у Венецыі

Гукавы кіно-тэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ"

ПРЭМ'ЕРА!

ТРЫ ПЕСНІ АБ ЛЕНІНЕ

Аўтар рэжысёр—Д. ВЕРТАЎ. Выканаўцы: М. ЖАРЫНОМФІЛЬМ.

Камазітар—ШАПОРЫН. Аркестр пад кіра н. БЛОК.

У ПР ГРАМЕ: Гукавы Саюзкінажурнал НА ВАРЦЕ СОЦЫЯЛІЗМА ПАРАД ВОЙСК МВА.

Штодзенна 4 сеансы

Пачатак у 6, 7-30, 9 і 10-30.

Касы з 1 гадз. дня.

Прымаюцца заяўкі на калектыўныя паходы і мэтавыя сеансы 6, 7 і 8 XI.

УСЕ НА ПРАДОЖЦЯБРСКІ КАЛГАСНЫ БАЗАР

да асенняга калгаснага БАЗАРА 4 і 5 лістапада

МЕНГОРСПАЖЫЎСАЮЗ

выступае на калгасных рынках з наступным асартыментам тавараў:

Гатовае адзенне	20.000 р.	Хусткі	5.000 р.
Галаўныя ўборы	5.000 р.	Маскацельныя тавары	5.000 р.
Галошы	10.000 р.	Рымкарныя	5.000 р.
Абутак	5.000 р.	Пасуда	5.000 р.
Мануфактура	10.000 р.	Скобяныя	10.000 р.
Трыкатаж	15.000 р.	Мыла гасп.	10.000 р.
Галантарэя	10.000 р.	Канд. вырабы	20.000 р.
Культтавары, шпалеры	5.000 р.	Мэбля	10.000 р.

УСЯГО на суму—150.000 р.

ГАНДАЛЬ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА:

1. На Чэрвеньскім рынку.
2. На Пл. Парыжскай Камуны.
3. На Менскім рынку.
4. На Юбілейнай плошчы.

Замежн. БДТ—1 вул. 24505 Белд аркестр тэ Оперы і Балета

Маста кі кіраўнік—засл. арт. рэсп. І. А. ТІТТАРЦ.

Сёння опера КНЯЗЬ ІГАР

Пачатак роўна ў 8 гадзін вечара.

ГУКАВЫ кіно-тэатр Чырвоная Зорка — НОВАЯ ПРАГРАМА. Замежны мастацкі фільм гастроль Отто Франкардзі

Гукавы кіно-тэатр Пролетарый — ЗА ПРОЛЯЧЫМ З ТАРЖКА. Канцэрт Усходн. ансамбля

Кіно Інтернацыянал — Совецкі мастацкі фільм ІАТІЦАР

Кіно СПАРТАК — ВЕЧАР КАМЕДЫЯ. Тры праграмы. 1 сеанс

СЁННЯ, 4-га лістапада ў 7 гадз. веч. у клубе Саюзгандаль. абслуж. (раг Комуністычнай і Энгельса)

адбудзецца

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР ЧЫРВОЛЫХ ПАРТЫЗАН

з сем'ямі, прысвечаны XVII гадавіне Окцябрскай рэволюцыі.

Гарадская партызанская камісія.

Інстытут філасофіі БелАН

Сёння, 4 лістапада, у 7 гадз. вечара адбудзецца

абарона дысертацыі тав. МЕЛЬЦАРА на годнасць кандыдата навук: Марксіцка-Ленінская тэорыя адлюстравання".

Апаненты выступаць акад. С. ВАЛЬФСО і кандыдат філасофскіх навук І. І. БЫЧКО і ст. навуковы работнік Г. ЛЕВІН.

Запрашаюцца навуковыя працаўнікі, аспіранты і студэнты. Уваход вольны.

Дырэкцыя.

Дзяржаўная бібліятэка і бібліяграфічны інстытут БССР імя Леніна,

на падставе пастановы Інстытута абвяшчае прыём на вышэйшыя 2-гадовыя БІБЛІЯТЭЧНЫЯ КУРСЫ

без адрыва ад вытворчасці.

На курсы прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме 9-гадзі, педтэхнікума, паліт асветтэхнікум і рабфака дадатковых мінімумаў курсаў, ку ст. па падрыхтоўцы БІБ, на ур рсе ад 17 да 35 гор. Пасля сканчэння выдаецца дыплом.

Заявы на імя дырэктара прымаюцца да 10.XI. 4 г.

Да заявы на імя дырэктара прыкладзены наступныя дакументы: анкета, заседчаны прысвечаны, бо совецкі кі, дакумент аб адукацыі, ме рыка, асабістая заява, фотаграфіі, дакумент аб адукацыі, ме рыка, асабістая 2 фотаграфіі.

Прыём на курсы праводзіцца па іспытах.

Для ўсіх асоб, якія маюць сярэднюю адукацыю і дагушчэнне прыймовай камісіяй іспытаў, іспыты п. ваюцца ў аб'ёме установленых праграм па наступных прадметах: беларускай мове і літаратуры, гісторыі і энциклапедыцы.

Пры залічэнні на курсы, пры адноль ковай падрыхтоўцы, перавага даецца рабочым і іх дзецям, а ежам настаўнікам, ка-тас ніям, дзецям навучэльхрастоматыкам, асобам навучальных складаў РСЧА, ядзі-цкі атасем тыт, хто прыраўнены ешча пастановай уряда да ўдзельнікаў грыўдзі, В. У да рабоч х.

Пры ўсіх іншых умовах перавага аддаецца ізраям на курсы спецыяльнасці бібліятэчных работнікаў.

Нач. бібліятэчнага кіраўніцтва Б. Г. СЛУЦ.

Дырэктар бібліятэкі і бібліяграфіі Інстытута БССР імя Леніна С. ІЗАНОВІЧ І.

ЦП саюза рабочых МТС і ба ратства разбуіняецца на 2 профсаюзы: саюз зямельных работнікаў і саюз рабочых МТС.

Профсаюз зямельных работнікаў ядна рабочых і служачых у апаратах НКЗБ, райзямаддзелаў, земпартыяк, мелія ацыйных і гідратэхнічных станцыях і партыяў, трыгонометрычнай сетцы, знаходзячыхся у ведамасці НКЗБ, сістэму Сельвоснаба, ветрамярную сетку, інструментальныя станцыі, бактэрыялагічныя станцыі і па расліннаводству, навукова даследчыя інстытуты, ВНУ, ВТУ, тэхнікумы, аддзелы, знаходзячыяся ў ведамасці НКЗ, Сельэлектра, работнікаў па найму ў калгасах і працуючых па найму ў індывідуальным сектары сельскай гаспадаркі і КСПО;

Саюз МТС ядна работнікаў сістэмы МТС, МТМ, будаўніцтва МТС, ставочных пры МТС палітаддзелаў МТС, вышэйшых с.-г. комуністычных школ, школ трактарыстаў і школ масавай авіяцыі.

Ільнозапеньмаслобойныя, ранней абслугоўваемыя профсаюзам МТС, перадаюцца на абслугоўванне профсаюза Ільнарыбкой.

З 1 лістапада 1934 г. у філіялах Дзяржбанка адкрыты новыя бягучыя рахункі па аперацыях, звязаных па збору членскіх узносаў і страхавносаў, а імянна:

1. Профсаюз зямельных работнікаў

Нумар рахунка па членскіх узносах	159-6058
па страхавых узносах	158-6058
аперацыйны рахунак Белканторы Дзяржбанка	159-10041

2. Профсаюз МТС:

Нумар рахунка па членскіх узносах	159-6160
па страхавых узносах	158-9130
Аперацыйны рахунак	159-10040

Райбанкам прыняць указанае да выканання.

Ліквідатар ЦП саюза рабочых МТС і б-ва Белканторы Дзяржбанка.

БЕЛАРУСКАЕ ІРАУНІ ТВА СУВЯЗІ

даводзіць да ведамасці, што для палепшэння арганізацыі перадачы тэлеграм

забраніваецца П Е Ш Ы тэлеграм

напісаных алоўкам, на ніжнім поле пачатай і на папіросных аркушах, а таксама на тэхнічна дрэнна пачатых, бесперадмоўна адказна ні асобамі ўрадовых тэлеграм і тэлеграм абагульненага сектара.

Менскаму мясакомбінату патрэбны ВЕТУРАЧ

на постаянную работу, убойны цэх, дробны ашчэрны, вышэйшы.

Звяртацца: мясакомбінат, дзяж. выторчасці.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 25

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ

1 ЛІСТАПАДА 1934 Г. Г. МЕНСК

АБ ЧАСТКОВАЙ ЗМЕНЕ ВУЛІЧНАГА РУХУ У г. МЕНСКУ

Менскі гарадскі совет пастанаўляе:

У правілы вулічнага руху ў гор. Менску, устаноўленыя абавязковымі пастановамі Менгорсовета ад 17 лютага 1933 года і 27 сакавіка 1934 года (§§ 8 і 74) унесці наступныя змены.

1. Забараніць рух грузавога транспарта як гужавога, так і аўтагрузавога па наступных вуліцах:

а) па Совецкай да вугла Мясніцкова і Нова-Бабруйскай да Салавей вул.;

б) ад вугла Інтэрнацыянальнай і Пл. Волі да Універсітэцкай.

в) вул. Энгельса ад вугла Окцябрскай да Універсітэцкай;

г) вул. К. Маркса ад вугла Свярдлоўскай да Чырвонаармейскай;

д) Чырвонаармейская ад вугла Совецкай да Універсітэцкай вул.;

е) вул. 11-га ліпеня — ад плацы пасажырскага вакзала да Свярдлоўскай вул.;

ж) вул. Інтэрнацыянальная — ад вугла Валадарскага да Пл. Волі.

2. У змену і дапаўненне § 76 пастановы ад 17-II-33 года ўстанавіць наступны маршрут для грузавога руху п. сер — пасажырскі вакзал — Ляхаўка, Бухарына, Свярдлоўская, Універсітэцкая, Паштовая, Гарбарня і Першамайская.

а) Устанавіць дадатковыя маршруты: раён Ляхаўка — Камароўка: Смаленская, Фрунзеўская, Совецкая;

б) маршрут Ляхаўка—Пяраспа (дадатковы): Смаленская, Фрунзеўская, Шырокая, Старажоўская і Пяраспа.

3. Заезд грузавога, гужавога і аўтагрузавога транспарта на забароненых для грузавога руху вул. дазваляецца ад бліжэйшага кварталу маршрута грузавога транспарта, пазначанага ў пар. 76 пастановы горсовета ад 17-II-33 года і ад 27-III-34 года з такім разлікам, каб праезд па забароненых вул. не быў большым як па 1-3 кварталы.

Ніваратыя ў парушэнні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб., або прымусовым работам да 15 дзён.

СТАРШЫНЯ МЕНГОРСОВЕТА ЖУКОВІЧ.
САКРАТАР МЕНГОРСОВЕТА ІПАТАЎ.

УСЕ НА ПРАДСВЯТОЧНЫ КАЛГАСНЫ БАЗАР

ДА АСЕННЯГА КАЛГАСНАГА БАЗАРА 4 і 5 лістапада

МЕНХАРЧГАНДАЛЬ арганізуе продаж тавараў на наступных рынках у крамах і ларках:

Чэрвеньскі рынак—2 ларкі; площа Парыжскай Комуны—крама 38, 15 і 2 ларкі; Крыты рынак—2 ларкі, Суражскі рынак—крама № 10; пл. 25 Окцябра—крама № 37 і Конны рынак—ларок.

У ПРОДАЖЫ ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ ТАВАРАЎ:

БАНСЕРВЫ—10.000 руб., КАМСА—15.000 руб., ЦУКАР—30.000 руб., ПІЧЭННЕ—45.000 руб., ЦУКЕРКІ—24.000 руб., ПАПІРОСЫ—12.000 р., ЗАПАЛКІ—1.000 р., МЫЛА ГАСПАДАРЧАЕ—30.000 руб., МАХОРКІ І ТАБАК—12.000 р., ЧАЙ—3.500 р., СОДА ДЛЯ БЯЛІЗНЫ—1.000 руб., БУЛКІ, БАРАНКІ, ЗДОБА—30.000 руб. МАКАРОН—20.000 руб., і інш. РЫС і КРУПА—18.000 р. Усяго на суму—25.000 руб.

Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫН.

Менск, друкарня «Звязды». Уп. Галоўлітбела № К—3287.